Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

פּראָלעטאַריער פֿון אַלע לענדער, פֿאַראייניקט זיך!

Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

СУБОТА 20 лютага 1932 г. № 41 (3430)

СЁНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫЯ: Да XIV гадавіны Чырвонай арміі. Чацьвёртаму году пяцігодкі—магутную фінансавую базу («Праўда»).

М. ЛЫНЬКОЎ. Ліст тав. Сталіна і задачы беларускай пралетарскай літаратуры (2 і 3 ст.). М. ІВАНОЎ. Наступленьне японскага капіталізму ў Кітаі (3 стар.).

ПАСТАНОВА СНК СССР ПРА ХОД ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ (1 стар.).

Партыйныя ячэйкі пры саветах павінны быць арганізуючым і кіруючым цэнтрам баявой падрыхтоўкі да трэцяй бальшавіцкай сяўбы (2 стар.).

У спаборніцтвы трохсот васьмі ўключыць лепшых з лепшых паравозьнікаў (2 стар.).

Культжылзбор—у цэнтр увагі фінпаходу (3 стар.).

ЗА ГРАНІЦАЙ

ЯПОНСКІ УЛЬТЫМАТУМ

ТОКІЁ. У міністэрстве замежных спраў адзначаюць, што японскі ўрад сёньня ўпаўнаважыў японскага пасланьніка ў Кітаі СІГЕМІЦУ прад'явіць ультыматум кітайскім войскам. Вызначэньне тэрміну ўльтыматуму прадстаўлена СІГЕМІЦУ. Думаюць, што СІГЕМІЦУ будзе патрабаваць, каб кітайскія войскі прыступілі да эвакуацыі зараз-жа пасьля атрыманьня ўльтыматуму.

Паводле слоў агенцтва СІМБУН-РЭНГО, у вайсковым міністэрстве ўпэўнены, што кітайскія войскі не адступяць бяз бою. У ваенным міністэрстве прадбачаць ускладненьне становішча, лічачы няўхільным уцягненьне сэтльмэнта ў сфэру ваенных дзеяньняў.

ТОКІЁ. Агенцтва СІМБУН РЭНГО ўказвае, што СІГЕМІЦУ ва ўльтыматуме кітайскаму камандваньню будзе патрабаваць адводу кітайскіх войск на 20 кілёмэтраў ад сэтльмэнта і французскай канцэсіі. Кітайцы, якія знаходзяцца ў межах 20-кілёмэтравай зоны, падлягаюць разброеньню. Адвод кітайскіх войск павінен пачацца праз 24 гадзіны пасьля ўручэньня ўльтыматуму і павінен быць закончан у 48 гадзін пасьля ўручэньня. Ультыматум будзе ўручаны сёньня кітайскаму МЭРУ ШАНХАЯ, а таксама ЦАЙ ЦІН-КАЮ (камандзір 19-й кантонскай арміі).

Агенцтва СІМБУН РЭНГО, на падставе паведамленьняў з Шанхая прадбачыць, што кітайскія войскі адхіляць ультыматум і што ў сувязі з гэтым НЯЎХІЛЬНЫ ВАЕННЫЯ ДЗЕЯНЬНІ ШЫРОКАГА МАШТАБУ.

Адваяваць Манчжурыю ад Японіі

ШАНХАЙ, 18. Газэта «Чайна Прэс» паведамляе, што Ву-Пэй-Фу прапанаваны пост галоўнакамандуючага «справядлівай добраахвотніцкай арміяй» у Манчжурыі.

Гэта армія, паводле паведамленьняў газэты, павінна складацца з некалькіх сот тысяч салдат і ставіць сабе мэтай адваяваньне Манчжурыі ад Японіі.

Разбраеньне добраахвотніцкіх атрадаў

ШАНХАЙ, 18. Кітайскі друк паведамляе, што кітайскія ўлады разброілі народны добраахвотніцкі атрад, сфармаваны на сродкі, сабраныя сярод насельніцтва.

Атрад складаўся з 300 добраахвотнікаў і знаходзіўся ў Путуне (правым беразе цэнтр недалёка ад Шанхая). Атрад меркаваў выступіць на Чапэй-Усуньскі фронт. Кіраўніку атраду было прапанавана распусьціць атрад, але кіраўнік адмовіўся выканаць гэта і быў арыштаваны. У Путун накіраваны батальён пяхоты, які разагнаў атрад.

Спатканьне галоўнакамандуючых

ШАНХАЙ. 18. Сёньня чакаецца спатканьне глаўкому 19-й кантонскай арміі Цай-Цін-кая з камандуючым японскімі сухапутнымі войскамі ў Шанхаі—Уэдай.

Дапушчаюць, што гутарка закране ўмовы адводу кітайскіх войск. У выпадку дасягненьня згоды ваенныя дзеяньні спыняцца. Гэтая сустрэча разглядаецца як апошняя спроба мірнага вырашэньня канфлікту. У выпадку няўдачы няўхільны ваенныя дзеяньні ў шырокім маштабе.

Перагаворы спынены

ШАНХАЙ. 18-II. Перагаворы паміж японскім і кітайскім камандваньнем спынены з прычыны няпрыняцьця кітайцамі японскіх патрабаваньняў.

Кітайскія сілы ў Шанхаі

ШАНХАЙ, 18-II. Газэта «Норд Чайна Дэйлі Ньюс» сьцьвярджае, што кітайцы зараз маюць у раёне Шанхая пяць армейскіх дывізій, а 19-ая армія атрымала значныя падмацаваньні.

Японцы бамбардыруюць Нанкін

ТОКІЁ, 18. Агенцтва «Сімбун Рэнго» паведамляе з Шанхая, што там учора адбывалася жорсткая артылерыйская перастрэлка.

Насельніцтва кітайскага гораду Нанкін ў паніцы. Пачалося ўцяканьне. Ходзяць чуткі што японскія войскі парашылі бамбардыраваць Нанкін.

Фронт—даўжынёю ў сотні міль

ШАНХАЙ. 18-II. Агенцтва «Рэйтэр» паведамляе, што ад Суйчжоў і адгэтуль на ўсход да Кайфына, Чжэнчжоў і Лояну — рыюцца траншэі, даўжынёю ў сотні міль.

У сучасны момант японцамі сканцэнтравана ў Шанхаі значна больш сотні ваенных аэрапляніаў.

Француская паліцыя разганяе дэманстрацыю кітайскіх беспрацоўных

ШАНХАЙ. 18. Некалькі сот кітайскіх беспрацоўных арганізавалі дэманстрацыю перад будынкам «Бюро па сацыяльных пытаньнях» муніцыпалітэту кітайскай часткі гораду, патрабуючы аказаньня харчовай дапамогі, каб выратаваць свае сем'і ад голаду і сьмерці. У дэманстрацыі ўдзельнічала шмат жанчын. Француская паліцыя пры дапамозе дубінак разагнала дэманстрацыю.

„Вярхоўны палітычны савет Манчжурыі і Мангоіі"

ТОКІЁ. 17 лютага. Агенцтва Дэмпо цусін паведамляе з Мукдэна што ўчора створан «вярхоўны палітычны савет Манчжурыі і Манголіі ў складзе: ЦАН Шы-і, Сі СЯ, генэрал МА, Чжан Цзін-гуя. Сакратаром савету назначан Чжао Сінь-бо (мукдэнскі мэр). Сёньня або заўтра палітычны савет разашле цыркулярныя тэлеграмы аб незалежнасьці Манчжурыі і Манголіі.

Учора члены палітычнага савету мелі некалькі сустрэч з прадстаўнікамі японскіх уладаў, у тым ліку і з генэралам Хондзіо.

Агенцтва сьцьвярджае, што ТАН Ю-лін (старшыня ўраду правінцыі Жэхэ) згадзіўся ўключыць правінцыю Жэхэ ў склад новай дзяржавы і пасылае сына ў якасьці свайго прадстаўніка ў Мукдэн. Паводле паведамленьня агенцтва генэрал Ма назначаны старшынёй хэйлунцзянскага ўраду замест Чжан Цзін-Гуя.

МУКДЭН. Першае пасяджэньне канфэрэнцыі, прысьвечанай стварэньню незалежнай дзяржавы павінна адбыцца 18 лютага ў Мукдэне. Згодна японскіх паведамленьняў, 35 дэлегатаў асобных раёнаў Манчжурыі і Манголіі будуць удзельнічаць у канфэрэнцыі. Канфэрэнцыя абгаворыць наступныя пытаньні: Выбары прэзыдэнта або імпэратара новай дзяржавы, стварэньне ўраду, вызначэньне дзяржаўнага сьцягу, назначэньне кіраўнікоў дзяржаўных органаў, арміі, прыняцьцё рашэньняў па асобных пытаньнях, у тым ліку па пытаньнях эканамічнай палітыкі, іміграцыі і г. д.

Паведамляюць, што былы кітайскі імпэратар Пу-і прыбыў у Мукдэн са сваімі ахоўнікамі. Дапушчаюць, што ён будзе назначаны галавой новай дзяржавы пасьля скончэньня работ канфэрэнцыі.

Нямецкія прапановы на канфэрэнцыі па „разбраеньні"

ЖЭНЭВА. 18-II. Сёньня на канфэрэнцыі выступіў нямецкі дэлегат Надольны, які абгрунтаваў нямецкія прапановы, што зводзяцца да наступнага:

зьнішчэньне баявых сродкаў служачых да наступацельных мэтаў; усеагульнае скарачэньне ўзброеных сіл і сродкаў; скасаваньне абавязковай вайсковай павіннасьці; забарона цяжкай артылерыі і ўсіх відаў газаў; забарона стварэньня ўмацаваных раёнаў, прапарцыянальнае скарачэньне розных катэгорый суднаў; забарона пабудовы авіяносцаў; забарона карыстаньня падводнымі лодкамі; зьнішчэньне ўсяго вайскова - паветранага флёту.

Пра ход падрыхтоўкі да весновай сяўбы

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР.

СНК БССР адзначае, што ход і тэмпы падрыхтоўкі да весновай сяўбы не забясьпечваюць выкананьне задач, паказаных у пастанове ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб весновай сельскагаспадарчай кампаніі (газ. «Савецкая Беларусь» за 1932 г., № 9).

Асноўнымі недахопамі ў падрыхтоўцы да правядзеньня весновай сяўбы зьяўляюцца:

а) да гэтага часу пляны сяўбы не даведзены да саўгасаў, калгасаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а ў радзе раёнаў кулацкім гаспадаркам ня вызначаны цьвёрдыя заданьні;

б) плян засыпкі насеньня выкананы толькі на 29,1 проц., загатоўкі насеньня—на 11 проц., ачысткі насеньня—на 12,6 проц., у радзе раёнаў цьвёрдыя заданьні па здачы кулацкімі гаспадаркамі насеньня не спагнаны;

в) дрэнна арганізавана захаваньне насеньня, у выніку чаго ў радзе раёнаў насеньне псуецца;

г) нездавальняюча ідзе рамонт сельскагаспадарчых машын і інвентару, асабліва трактароў;

д) належным чынам не скарыстоўваецца санная дарога для вывазкі гною, завозу вапны і мінэральнага ўгнаеньня;

е) дрэнна пастаўлена апэрацыйная справаздачнасьць аб ходзе падрыхтоўкі да весновай сяўбы;

ж) слаба ідзе мабілізацыя грамадзкасьці вакол выкананьня задач весновай сяўбы.

Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць Народны Камісарыят Землеробства, Белкалгасцэнтр, с. г. трэсты і аб'яднаньні і Беладдзяленьне Трактарацэнтру, раённыя выканаўчыя камітэты, гарадзкія і сельскія саветы закончыць давядзеньне плянаў да саўгасаў, калгасаў і аднаасобнікаў да 1 сакавіка.

2. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам, сельскім саветам, Белкалгасцэнтру і Беларускаму Аддзяленьню Трактарацэнтру закончыць засыпку насенных страхавых фондаў і 100 процантную ачыстку насеньня да 15 сакавіка, а таксама ўстанавіць у саўгасах і калгасах штодзённы кантроль за захаваньнем насеньня, арганізаваўшы абгляд усяе забуртованай бульбы і, калі будзе выяўлена загніваньне, неадкладна перабіраць яе для папарджаньня далейшага псаваньня.

3. Прапанаваць Белхлебжывёлсаюзу, Беллёнаканаплеводсаюзу, Белсадгародсаюзу, Насенкалгассаюзу, Бел. Канторы Насенаводаб'яднаньня і раённым выканаўчым камітэтам ужыць самыя рашучыя захады да ўзмацненьня загатовак насеньня з тым, каб пляны былі выкананы да 15 сакавіка, і закончыць абмалот насеньня ў дэкадны тэрмін.

4. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і Белкалгасцэнтр зараз жа пачаць арганізацыю міжкалгаснай (у межах раёну) узаемадапамогі насеньнем.

5. Абавязаць Белсельгассснаб, Упаўнаважанага Саюзнафты, Белкапсаюз і сыстэмы с. г. кааапэрацыі да выхаду ў поле выканаць плян завозу машын і 100-процантную іх рэалізацыю, забясьпечыўшы адначасова трактарны парк запаснымі часткамі, гаручым і змазачнымі матэрыяламі, скарыстаўшы поўнасьцю санную дарогу для завозу іх у глыбінныя пункты з тым, каб гаручага і змазачных матэрыялаў было ня менш месячнага запасу.

6. Прапанаваць Беларускаму Аддзяленьню Мінугнаеньня, Белкаапрамсаюзу і раённым выканаўчым камітэтам максымальна скарыстаць санную дарогу для завозу вапны і мінэральнага ўгнаеньня беспасрэдна ў саўгасы і калгасы і вывазу гною на поле.

7. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам у дэкадны тэрмін арганізаваць масавы абгляд у саўгасах і калгасах якасьці ўтрыманьня коняй і скончыць стварэньне бракіраваных фуражных фондаў да 15 сакавіка.

8. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, гарадзкія саветы с. г. трэсты і аб'яднаньні падаваць паводле ўстаноўленых форм і ў вызначаныя тэрміны Народнаму Камісарыяту Землеробства апэрацыйную справаздачнасьць.

9. Лічыць патрэбным, каб цэнтральны і раённы друк больш шырока асьвятляў ход падрыхтоўкі да весновай сяўбы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР Ф. СУЛКОЎСКІ.

17 лютага 1932 г.
г. Менск.
№ 73.

ДА 14 ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

23 лютага Чырвоная армія разам з усімі працоўнымі Савецкага саюзу сьвяткуе 14 гадавіну свайго існаваньня.

Чатырнаццатую гадавіну гераічнай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі СССР—краіна будуючая сацыялізм—сустракае ва ўмовах шырока разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва; у абставінах усё больш абвастраючагася сусьветнага крызісу капіталізму.

На грунце правільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, у нязрымірымай барацьбе на два фронты, працоўныя СССР атрымалі буйнейшыя перамогі, завяршылі пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі, уступілі ў апошні, чацьверты завяршаючы год першай пяцігодкі.

На грунце гэтых посьпехаў рабочая кляса Савецкага саюзу, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б), стварае гіганцкі плян сацыялістычных работ у другой пяцігодцы, высоўваючы асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі канчатковую ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул «поўнае зьнішчэньне прычын, якія параджаюць клясавую розьнь і эксплёатацыю і перамаганьне перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньня ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бяскласавай сацыялістычнай грамады» (з паст. 17 партканфэрэнцыі).

Разам з ростам сацыялізму ў нашай краіне расьце і мацнее абароназдольнасьць СССР, мацнее яго ўзброены атрад і вартавы—Чырвоная армія.

Да 14 гадавіны свайго існаваньня Чырвоная армія падыходзіць з вялізарнымі дасягненьнямі ў сваёй баявой падрыхтоўцы, у аўладаньні вайсковай тэхнікай і марксысцка-ленінскай тэорыяй.

Абкружаная ўвагай і любоўю працоўных, рабоча-сялянская Чырвоная армія гатова ў любы момант стаць на абарону граніц сацыялістычнай бацькаўшчыны пралетарыяту, даць руйнуючы адпор імпэрыялістам, якія шукаюць выхад з усё больш узрастаючага крызісу—у вайне супроць СССР.

Сучасная міжнародная абстаноўка настойліва патрабуе далейшага ўмацаваньня абароннай сілы СССР, яшчэ большага ўмацаваньня абароназдольнасьці Чырвонай арміі.

Усё больш востра паўстае небясьпека новай імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі. Капіталісты, пры актыўнай падтрымцы сацыял-здраднікаў усіх краін, ліхарадачна ўзбройваюцца. Захоп японскімі імпэрыялістамі Манчжурыі, правакацыйная палітыка Лігі нацый, якая фактычна дала санкцыю на падзел Кітаю, зьяўляюцца найбольш яскравымі паказьнікамі абвастрэньня супярэчнасьцяй імпэрыялістычнай сыстэмы і абвастрыўшайся пагрозы вайны.

Нарэшце, правядзеньне сусьветнай канфэрэнцыі па разбраеньні ў Жэнэве, якая пад заслонай размоў аб разбраеньні, фактычна займаецца падрыхтоўкай базы да яшчэ большага ўзбраеньня. На гэтай канфэрэнцыі абгаварваецца прапанова Францыі аб стварэньні новай інтэрнацыянальнай арміі пры Лізе нацый, што па сутнасьці, як зусім правільна падкрэсьліў т. Літвінаў у сваёй прамове на канфэрэнцыі, была-б накіравана супроць нас, супроць СССР. Усё гэта прымушае нас быць на варце, пільна сачыць за прошукамі ворага, па-бальшавіцку рыхтавацца да абароны.

Апублікаваная ад 18 лютага, пастанова ЦК КП(б)Б высоўвае перад КП(б)Б канкрэтныя практычныя задачы ў падрыхтоўцы да 14 гадавіны РСЧА.

Гэтыя задачы зводзяцца, у асноўным, да мабілізацыі шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў і працоўных мас гораду і вёскі вакол практычнага вырашэньня чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва, на аснове рэалізацыі пастаноў XVII партканфэрэнцыі УсеКП(б) і XIV зьезду КП(б)Б.

ЦК КП(б)Б прапануе падрыхтоўку і сьвяткаваньне гадавіны цесна ўвязаць з барацьбой за прамфінплян, з выкананьнем плянаў загатовак збожжа, лёнавалакна, мяса і лесу, з практычным ажыцьцяўленьнем шасьці ўказаньняў т. Сталіна і пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4-II аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, што зьяўляецца магутнейшымі фактарамі ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР.

Прапановы ЦК КП(б)Б прадугледжваюць шырокую праверку сацыялістычных дагавароў паміж прадпрыемствамі і чырвонаармейскімі часьцямі, рашучае ўзмацненьне шэфскай работы, выяўленьне лепшага вопыту ее правядзеньня. Для гэтай мэты з 18 па 25 лютага праводзіцца агляд шэфскай работы. Важнасьць агляду, кароткасьць тэрміну яго правядзеньня патрабуе ад усіх партыйных і савецкіх арганізацый, прафсаюзаў, камсамолу і Асоавіяхіму неадкладнага ўключэньня і ўдарнага правядзеньня агляду.

Надзвычайна важна поўнасьцю забясьпечыць удзел у гэтай важнай кампаніі вайсковых часьцей, шырока азнаямляць рабочых і работніц з гісторыяй Чырвонай арміі, а чырвонаармейцаў з гісторыяй фабрык і заводаў.

Гарадзкія і сельскія саветы, сэкцыі і дэпутацкія групы павінны праверыць выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб паляпшэньні матэр'яльна-бытавых умоў чырвонаармейцаў і камначсаставу, ужыўшы ўсе меры да ўзмацненьня гэтай работы.

Выкананьне ўказаных вышэй палітычных мерапрыемстваў, як і астатнія прапановы ЦК КП(б)Б аб сьвяткаваньні чатырнаццатай гадавіны Чырвонай арміі, павінна ўзьняць на вышэйшую ступень сувязь прадпрыемстваў і калгасаў з Чырвонай арміяй, падвышэньне яе абароназдольнасьці, вайсковую падрыхтоўку працоўных.

Урад СССР неаднаразова паказаў сваю шчырую міралюбчую палітыку. Усе спробы імпэрыялістаў справакаваць краіну пралетарыяту на вайну, разьбіваліся аб мірныя імкненьні краіны, будуючай сацыялізм.

Аднак, не жадаючы вайны, вядучы рашучую барацьбу за мір, неаслабна працягваючы вялікую будову сацыялізму, рабочая кляса і ўсе працоўныя СССР павінны быць гатовы ў любую хвіліну даць руйнуючы адпор азьвярэламу ворагу.

У краіне шыбеніц

Працяг камэдыі „суда" над Палянскім

ВАРШАВА. 18-II. Учора ў Вярхоўным судзе ў Варшаве разглядалася касацыйная скарга пракурора на рашэньне апэляцыйнага суда па справе Палянскага.

Як вядома, акруговы суд прыгаварыў у свой час Палянскага за арганізацыю замаху на выбух будынку паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Варшаве да 10 год катаржнай турмы. Апэляцыйны суд зьмяніў прыгавор першай інстанцыі і скараціў тэрмін пакараньня Палянскага да 3-х год турмы.

Пракурор у сваёй касацыйнай скарзе зазначыў, што апэляцыйная інстанцыя не прывяла дастатковых аргумэнтаў у абарону свайго пункту гледжаньня аб тым, што замах ня мог пацягнуць за сабой чалавечыя ахвяры. Пракурор далей зазначыў, што суд ня прыняў пад увагу акалічнасьць, якая абцяжвае віну, што замах на будынак чужаземнага прадстаўніцтва — паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР, улгона накіраваны таксама супроць дзяржаўных інтарэсаў Польшчы.

Пасьля прамовы абаронцы Гофмокл - Астроўскага, Вярхоўны суд вынес рашэньне, якое адхіляе скаргу пракурора.

Такім чынам, рашэньне апэляцыйнага суда, які прысудзіў Палянскага да 3-х год турмы з залікам папярэдняга зьняволеньня, зацьверджана Вярхоўным судам.

Новыя катаржныя прысуды

ВАРШАВА. Паводле паведамленьня друку, варшаўскі акруговы суд вынес прысуд па справе так званай «камуністычнай тэхнікі». Трое абвінавачаных прысуджаны да катаржнай турмы тэрмінам на 6 год, двое — да пяці год катаргі, адзін — да 4 год, трое —да 3 год і адзін абвінавачаны—да 9 месяцаў турэмнага зьняволеньня. Скончылася слуханьнем справа Камінскага і яго таварышоў па абвінавачваньні ў камуністычнай прапагандзе ў арміі. Абвінавачаныя прысуджаны да 4 год катаржнай турмы кожны.

Акруговым судом у Любліне па абвінавачваньні ў камуністычнай дзейнасьці прысуджаны Адамовіч — да 2 год, Пентэк — да 2 год і Зарэмба— да 2 год катаржнай турмы.

Забастоўка гарнякоў Дамброўскага і Кракаўскага басэйнаў

ВАРШАВА. 18-II. Сёньня, як і чакалася, выбухнула забастоўка гарнякоў Дамброўскага і Кракаўскага басэйнаў. Паводле газэтных вестак, бастуе каля 29 тыс. рабочых. Толькі на некалькіх нязначных шахтах працягвае працаваць каля 750 чалавек. Ля шахт узмоцненыя паліцэйскія патрулі. Чакаецца пашырэньне забастоўкі і на Верхнюю Сілезію.

Рабочыя мэталюргічнай прамысловасьці рыхтуюцца да падтрыманьня забастовачнай барацьбы гарнякоў.

„Рыцары тайнай рукі"

Пад такой назвай у Беластоку (Польшча) існавала тайная арганізацыя моладзі. Яна складалася пераважна з вучняў.

Паводле паведамленьняў польскага друку, гэтая арганізацыя была выкрыта пры наступных абставінах: улетку 1931 году ў ваколіцах Белавежа быў знойдзен труп аднаго гандляра—нейкага Бажэнка. Як высьветлілася зараз—гэтае забойства было ўчынена членамі таварыства «Рыцары тайнай рукі».

Гэтая арганізацыя ставіла сваёй мэтай «зьнішчэньне людзкой несправядлівасьці, выпраўленьне парушэньняў зробленых прыгнечаным і ўстанаўленьне матэр'яльнай роўнасьці».

Справа «Рыцароў тайнай рукі» будзе слухацца ў беластоцкім судзе.

Сам факт існаваньня «рыцараў тайнай рукі» і іншых да таго падобных таварыстваў яскрава характарызуе тое брузаваньне, якое ў выніку цяжкага эканамічнага крызісу ахапіла нават частку дробнабуржуазнай моладзі Польшчы.

Голад і выміраньне спустошаюць Закарпацкую Украіну

БЭРЛІН, 17-II. «Камітэт выратаваньня працоўных Закарпацкай Украіны» (межрабпому) наладзіў у Бэрліне прыём друку.

Выступіўшы на прыёме член Праскай дэлегацыі межрабпому намаляваў жудасны малюнак голаду, галечы і выміраньня мясцовага насельніцтва Закарпацкай Украіны. Паміж усімі жыхарамі ёсьць беспрацоўныя, якія не атрымліваюць ніякай дапамогі. На працягу раду год харчаваньне насельніцтва складаецца выключна з бульбы і травянога крупніку бяз солі. Людзі зусім зьнясілены. Камітэт у бліжэйшыя дні высылае туды некалькі вагонаў з прадуктамі харчаваньня.

МАСАВАЕ ВЫСЯЛЕНЬНЕ З КВАТЭР БЕСПРАЦОЎНЫХ (АМЭРЫКА).

НА ЗДЫМКУ: Выкінутая на вуліцу маёмасьць беспрацоўнага.

Чацьвертаму году пяцігодкі—магутную фінансавую базу

Выключнае значэньне барацьбы за народна-гаспадарчы плян 1932 г. асабліва рэльефна выступае ў асьвятленьні гістарычных рашэньняў XVII-й партыйнай канфэрэнцыі. Вялізарны новы ўздым вытворчых сіл краіны, рэканструкцыя ўсіх галін гаспадаркі, ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул. Пабудова сацыялістычнага грамадзтва, як цэнтральная задача 2-й пяцігодкі, настойліва патрабуюць у 1932 годзе бязумоўнага выкананьня пляну 1-й пяцігодкі. З другога боку, паглыбленьне сусьветнага эканамічнага крызісу, рост варожасьці імпэрыялістычных дзяржаў да СССР у сваю чаргу абавязваюць нас да ўдарнай, баявой, сапраўды бальшавіцкай барацьбы за выкананьне народна-гаспадарчай праграмы 1932 г. для ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР.

Характарнай асаблівасьцю народна-гаспадарчага пляну 1932 г. зьяўляецца ўсё ўзрастаючы шырокі рух за забесьпячэньне нашай эканамічнай незалежнасьці ад капіталістычнага сьвету, за аўладаньне новай тэхнікай, за шпарчэйшае разгортваньне новых вытворчасьцяй.

Барацьба за фінансавы плян, за дзяржаўны бюджэт, за гаспадарчы разьлік, за накапленьне гаспадарчымі органамі, за выкананьне праграмы даходаў, за рэжым эканоміі ў расходах, за крэдытную дысцыпліну, за ўмацаваньне грашовай сыстэмы набывае выключнае значэньне і патрабуе да сябе выключнай увагі.

У 1932 г. ня менш 90 проц. усяго народнага даходу павінна быць атрымана ў аграмаджанай гаспадарцы. Гэта адбівае вялізарныя посьпехі нашага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, але гэта накладае таксама і вялізарную адказнасьць на ўсе дзяржаўныя прадпрыемствы за накапленьне рэсурсаў для сацыялістычнага будаўніцтва.

Накапленьне ў нашай аграмаджанай гаспадарцы мае рашаючае значэньне, у першую чаргу ўнутры прамысловае накапленьне.

Падвышэньне на 22 проц. прадукцыйнасьці працы, зьніжэньне ня меньш чым на 7 проц. сабекошту прамысловай вытворчасьці, зьніжэньне на 12 проц. сабекошту будаўніцтва, рацыяналізацыя транспартных перавозак, рацыяналізацыя сфэры звароту, усе гэтыя рычагі накапленьняў у аграмаджанай гаспадарцы павінны быць скарыстаны цалкам, каб поўнасьцю забясьпечыць праграму накапленьняў аграмаджанай гаспадаркі, перавышаючую 8 мільярдаў руб. Самае нязначнае хоць-бы часовае, паслабленьне націску на гэтыя рычагі значыла-б страту ў накапленьнях аграмаджанай гаспадаркі і разам з тым паслабленьне нашай барацьбы за выкананьне пляну 4-га, завяршаючага году першай пяцігодкі.

У 1931 г. партыя разгарнула шырокую работу на фінансавым фронце. Дзесяткі тысяч ударнікаў фінансавай работы—рабочых і калгасьнікаў—забясьпечылі сваёй актыўнасьцю выкананьне і перавыкананьне фінансавай праграмы мінулага году. Такія ўзоры масавай работы на фінансавым фронце, як правядзеньне тыржу пазыкі ў Днепрапятроўску, як работа Падольскага заводу, заводу імя Карла Маркса ў Ленінградзе, электразаводу ў Маскве па мабілізацыі сродкаў, як зьлёты ўдарнікаў фінансавай работы ў сярэдняй Волзе, у Ніжагародзкім краі і ў Іванава-прамысловай вобласьці павінны атрымаць усямернае падтрыманьне і далейшае разьвіцьцё.

Але калі ў 1931 г. масавая работа разгортвалася пераважна вакол розных форм мабілізацыі сродкаў насельніцтва, дык у 1932 г. масавая работа павінна быць з яшчэ большай сілай разгорнута і па накапленьні ўнутры аграмаджанай гаспадаркі, і ў першую чаргу па ўнутрыпрамысловым накапленьні.

Не паслабляючы тэмпаў барацьбы за ўцягненьне сродкаў насельніцтва, трэба ўзьняць пралетарскія масы на барацьбу за накапленьне ўнутры аграмаджанай гаспадаркі, за накапленьні на фабрыках, заводах, у саўгасах, у МТС, на чыгунках і г. д. Мільённыя масы рабочых павінны стаць на варце гаспадарчага разьліку і сацыялістычнага накапленьня,—у гэтым адна з важнейшых задач нашай барацьбы за народна-гаспадарчы плян.

Наступнай крыніцай накапленьняў, якое мае першараднае значэньне, зьяўляецца разгортваньне савецкага гандлю. Не выпадкова XVII партканфэрэнцыя з асаблівай сілай падкрэсьліла, што «разгортваньне тавараздвароту,—перш за ўсё розьніцы,—і правядзеньне прынцыпу гаспадарчага разьліку ва ўсёй гаспадарчай рабоце зьяўляецца важнейшым стымулам для выяўленьня маючыхся ў нашай гаспадарцы вялізарных і далёка яшчэ не скарыстаных ўнутраных рэсурсаў, якія забясьпечваюць паскарэньне росту сацыялістычнага накапленьня і тым самым ўзмацняюць матэр'яльную базу ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва».

Плян таваразвароту на 1932 г. па сыстэме спажыўкаапэрацыі і дзяржгандлю прыняты ў разьмеры звыш 35 млрд. рублёў, а на першы квартал—у разьмеры 8 млрд. руб. Гэта праграма таваразвароту павінна быць ня толькі выканана, але і перавыканана. Да гэтага ёсьць усе магчымасьці ва ўзрастаючай вытворчасьці краіны.

XVII партыйная канфэрэнцыя падкрэсьліла антыбальшавіцкі характар «левай фразы» аб пераходзе «да прадуктаабмену» і аб «адміраньні грошай ужо на данай стадыі будаўніцтва сацыялізму».

Партыя б'е па «лявацкіх» памылках роўна як і па праваапартуністычным скажэньні гаспадарчага разьліку, партыя б'е па тэй антыбальшавіцкай няўвазе да справы тавараабароту, нескарыстаньні ўсіх магчымасьцяй для разгортваньня савецкага гандлю і ўзмацненьня накапленьняў, з якімі мы, нажаль, сустракаемся вельмі часта ў практычнай рабоце.

Разгарнуць савецкі гандаль і гэтым палепшыць забясьпячэньне працоўных, выкрыць нескарыстаныя рэсурсы і аддаць іх на справу сацыялістычнага будаўніцтва — такаво патрабаваньне партыі.

Цалкам захоўвае сваё вялікае значэньне і для 1932 г. справа ўцягненьня сродкаў насельніцтва як па лініі падаткаў, так і з асабліва па лініі добраахвотнага ўдзелу шырокіх мас насельніцтва сваімі зьберажэньнямі ў сацыялістычным будаўніцтве (пазыкі, уклады ў ашчадкасы, паянакапленьні і г. д.). У 1931 г. гэта работа ішла пад баявым лёзунгам 100-процантнага выкананьня пляну даходаў. Гэты баявы лёзунг захоўвае сваю сілу і для 1932 г.

Між тым, студзень паказвае, што некаторыя вобласьці і краі зьнізілі тыя баявыя тэмпы работы, якія далі выкананьне і перавыкананьне пляну 1931 г. Трэба з усёй сілай ударыць па тэтых дэмабілізацыйных, апартуністычных настроях.

Узрастаючыя даходы насельніцтва, шырачэзная папулярнасьць нашай праграмы сацыялістычнага будаўніцтва і ўзрастаючая сацыялістычная арганізаванасьць рабочых і калгасьнікаў дазваляюць і абавязваюць праграму ўцягненьня сродкаў насельніцтва выконваць так, каб сапраўды кожную дэкаду было забясьпечана 100-процантнае выкананьне пляну даходных паступленьняў.

XVII партканфэрэнцыя з усёй сілай падкрэсьліла першачарговае значэньне разгортваньня таваразвароту і правядзеньня прынцыпу гаспадарчага разьліку, што і ў пэрспэктывах другой пяцігодкі сыстэма савецкага гандлю і грашовая гаспадарка павінны будуць адыграць выключную ролю ў арганізацыі накапленьняў і ў забясьпечаньні ўсяго ходу сацыялістычнага будаўніцтва. З тым большай сілай мы павінны патрабаваць забясьпечаньня накапленьняў, умацаваньня гаспадарчага разьліку, барацьбы за мабілізацыю рэсурсаў па ўсёй лініі ў 1932 г., завяршаючым першую пяцігодку і ствараючым выходную базу для вырашэньня гіганцкіх задач другой пяцігодкі.

Узьняць на палітычную вышыню патрабаваньне гаспадарчага разьліку, шырэй разгарнуць удзел працоўных мас у барацьбе за накапленьне прыбыткаў, забясьпечыць безумоўнае выкананьне плянаў у мабілізацыі сродкаў, па-бальшавіцку змагацца за рэжым эканоміі, за бюджэтную і крэдытную дысцыпліну, за паскарэньне сацыялістычнага накапленьня ў СССР,— гэта патрабуе партыя, гэтага патрабуюць інтарэсы сацыялістычнага будаўніцтва. Чацьвёртаму году пяцігодкі — магутную фінансавую базу. («Праўда»).

22-га лютага а 7-й гадзіне ўвечары

ў памяшканьні „Дому Культуры"

АДБУДЗЕЦЦА ЎРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ МЕНГАРСАВЕТУ

з удзелам партыйных, камсамольскіх, прафэсыйных, грамадзкіх арганізацый і вайсковых частак Менскага гарнізону,

прысьвечанае XIV гадавіне Рабоча - Сялянскай Чырвонай арміі.

Члены і кандыдаты Менгарсавету, члены ЦК і ЦКК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, СНК, ЦВК і ЦСПСБ, члены Гаркому і Гар. КК КП(б)Б, Гаркому ЛКСМБ і ГСПС, чырвоныя партызаны і чырвонагвардзейцы праходзяць на сваіх мандатах.

Запрашальныя білеты прадпрыемствы і ўстановы атрымоўваюць у Менгарпрафсавеце, а вайсковыя часткі ў Менгарсавеце.

У СПАБОРНІЦТВА ТРОХСОТ ВАСЬМІ
уключыць лепшых з лепшых паравозьнікаў

Задача партыйных арганізацый на вузлах—узначаліць падрыхтоўку да другога конкурсу, узначаліць яго правядзеньне, дамагчыся рашучага аздараўленьня паравознай гаспадаркі

Падрыхтавацца да другога ўсесаюзнага

Другі ўсесаюзны конкурс лепшых спараных брыгад — **ВАЖНЕЙШАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА** ў па замацаваньні спаранай язды. Другі ўсесаюзны — **ВАЖНЕЙШАЕ ЗЬВЯНО**, пацягнуўшы якое, мы здолеем выраўняць увесь ланцуг — даб'емся здаровага паравознага парку максымальна - актыўнай работы кожнага паравоза, мінімальнай траты апалу і змазачных матар'ялаў, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Тыя дні, якія засталіся да пачатку конкурсу, у значнай ступені рашаюць посьпех усёй работы па конкурсе. Рашае, значыць, **ПАДРЫХТОЎЧАЯ РАБОТА**, вылучэньне лепшых кандыдатаў, здольных энэргічна змагацца за лепшае, за перадавое месца ва ўсесаюзным маштабе.

На вузлах зараз-жа, у гэтыя-ж дні трэба распачаць падрыхтоўчую работу.

ПАРТЫЙНЫЯ КАЛЕКТЫВЫ, улічыўшы вопыт першага ўсесаюзнага і ўсебеларускага конкурсу, зараз не павінны дапусьціць ранейшых памылак. Вылучаных машыністаў на конкурс абкружыць усямерным садзейнічаньнем у рабоце. Тыя дасягненьні, якія конкурснымі машыністамі будуць дасягацца, неадкладна і сыстэматычна папулярызоўваць сярод усіх паравозьнікаў; рабіць іх агульным здабыткам, такім здабыткам, які стымуляваў-бы агульнае падвышэньне карыснай работы паравознай гаспадаркі.

Мы яшчэ раз напамінаем аб тым, што ад удзелу ў конкурсе **НІЯК НЕ АДХІЛЯЮЦЦА** і тыя машыністы, якія ў конкурс ня будуць уключаны. Такія машыністы, дамогшыся рэкордных паказьнікаў, што дадуць ім права на спаборніцтва паміж 308, будуць удзельнічаць у разьмеркаваньні месц. Гэта патрабуе **АСАБЛІВА** шырокай масавай работы вакол правядзеньня другога ўсесаюзнага конкурсу.

Разгарнуць гэтую масавую работу абавязаны партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі **НА ЧЫГУНЦЫ**. Гэты-ж абавязак ляжыць на партыйных і прафсаюзных арганізацыях **ГАРАДОЎ**, якія таксама адказваюць за становішча на чыгунцы і за правядзеньне другога конкурсу.

Правядзеньне падрыхтоўчай работы да конкурсу — практычнае заданьне для **ВІЦЕБСКІХ ГАРАДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ** якія прышлі на дапамогу чыгуначнікам.

ДЭПУТАЦКІЯ ГРУПЫ НА ВУЗЛАХ ТРАНСПАРТНЫЯ СЭКЦЫІ ПРЫ САВЕТАХ таксама маюць шырокае поле дзейнасьці. Яны абавязаны прыняць удзел у падрыхтоўчай рабоце і рабоце па конкурсе. **ГОМЕЛЬСКАЯ** транспартная сэкцыя пры гарсавеце, якая разгортвае работу на вузьле, абавязана ўключыцца і ў конкурс. Тое-ж самае датычыцца Віцебскай, Аршанскай Менскай сэкцый і груп, груп усіх вузлоў.

Да рэчы, **АБ МЕНСКАЙ СЭКЦЫІ**. Аб яе бязьдзейнасьці мы пісалі ўжо. Зараз, за няўменьне кіраваць работай, бюро сэкцыі распушчана. У дрэннай рабоце сэкцыі трэба рашуча абвінаваціць і **МАСАВА - АРГАНІЗАЦЫЙНЫ** аддзел гарсавету, які ня здолеў апэрацыйна кіраваць сэкцыяй. Зараз зрух у рабоце зроблены і яго трэба замацаваць. Значны абавязак на сэкцыі— па арганізацыі конкурсу.

Практычнай падрыхтоўкай да другога ўсесаюзнага, вылучэньнем лепшых кандыдатаў для ўдзелу ў ім, разгортваньнем масавай работы на вузлах — сустрэнем пачатак конкурсу.

С-52 і С-305
кандыдаты на спаборніцтва

Гэтымі днямі Белбюро ЦК чыгуначнікаў заслухала інфармацыі конкурсных спараных гаспадарчаразьліковых брыгад з паравозаў С—52 (Гомель) і С—305 (Жлобін). Інфармацыі ахапілі ўсю праробленую работу брыгадамі і дакладна характарызавалі тыя мэтады, праз ужываньне якіх на гэтых паравозах дасягнуты бальшавіцкія тэмпы. Брыгадзіры расказвалі аб тэй ударнай і масавай рабоце, дзякуючы якой яны сталі ў рады перадавых па конкурсе.

З моманту пераходу на гаспадарчы разьлік, паравоз С—305 за 2 месяцы сваёй работы даў 292 руб. лі 17 кап. эканоміі. Паравоз С—52 за чатыры месяцы сваёй работы даў 802 р. 35 кап. эканоміі. С—52 даў 25 проц. эканоміі палів, а паравоз С—305—каля 30 проц.

Паравозы ня мелі ніводнага выпадку зрыву спаранай язды. З таго часу, як над гэтымі паравозамі было ўзята шэфства рамонтных брыгад дэпо, паравозы знаходзяцца ў здаровым і гаспадарчым становішчы.

Разгортваючы масавую работу, пераносячы вопыт сваёй работы на іншыя паравозы, гэтыя спараныя брыгады ўцягнулі ва ўнутраны конкурс вялікую колькасьць іншых брыгад. Паравоз С—52 уцягнуў 49 паравозаў, а паравоз С—305 —12 паравозаў. Дзякуючы гэтаму, паравозы на Гомельскім вузьле за студзень далі каля 500 тон эканоміі апалу.

Правільная і ўдарная пастаноўка работы на памянёных паравозах з усёй яскравасьцю паказвае, што няма дрэнных паравозаў, цягнікоў і дрэннага вугалю, а ёсьць дрэнныя паравозныя брыгады.

Другі ўсесаюзны конкурс спараных павінен дапамагчы таму, каб вопыт С—52 і С—305 перанесьці на іншыя паравозы. **Паравозныя брыгады С—52 і С—305 трэба ўключыць ў другі ўсесаюзны.** За час конкурсу яны павінны дамагчыся яшчэ больщых вымернікаў работы. Аздараўленьне паравознай гаспадаркі—галоўнейшае зьвяно на ўсіх вузлах. І гэтаму павінен шмат у чым дапамагчы другі конкурс.

Б. Т.

Паравозная гаспадарка павінна быць здаровай

Гістарычны зварот ЦК і СНК аб ліквідацыі абязьлічкі і ўвядзеньні спаранай язды Жлобінскі чыгуначны раён спаткаў з глыбокім прарывам у паравознай гаспадарцы. У сакавіку—месяцы фактычнага пачатку змаганьня за спараную, раён меў 32,7 проц. хворых паравозаў. У Асіпавічах гэтая лічба дасягала 45 проц. У 83 пр. усіх паравозаў цеклі трубы, што вяло да спыненьня ў дарозе, адмены цягнікоў, зрываў графіку. Якасьць рамонту была на самым нізкім узроўні. Толькі за сакавік колькасьць паўторных рамонтаў дайшла да 496.

Гэтыя лічбы, аднак, не пераконвалі асобных гаспадарнікаў, нават асобных партыйцаў. Знайшліся аматары абязьлічкі, якія перашкаджалі ўвядзеньню спаранай. Дырэктар Заходніх чыгунак Навумаў доўгі час тармазіў перавод на спараную. Пасобныя адміністратары ачкоўцірацельствам захавалі свае ігнараваньне спаранай. Так, у красавіку начальнік дэпо Жлобін рапартаваў аб 100-процантным замацаваньні спаранай. Праверка-ж паказала, што спараная замацавана ўсяго на 24 проц.

Кіраўніцтва, якое ня здолела змагацца за спараную, атрымала па заслугах. У Асіпавічах за зрыў спаранай быў зьняты ўвесь трыкутнік дэпо.

І з гэтага часу пачалося ўкараненьне спаранай, было праведзена сапраўднае прымацаваньне брыгад да паравозаў. Да кожнага паравоза быў прымацаваны партыец, або камсамолец, якія адказвалі за становішча машыны. Перабудавана была і работа ў самім дэпо.

Перабудова работы, увага і штодзённы кантроль за ўвядзеньнем спаранай—далі свае станоўчыя вынікі. Процант хворых паравозаў у лістападзе складаў ужо толькі 12,76 пры заданьні ў 14,37 проц. Спараная замацавана па паравозах на 95,85 проц., а па брыгадах—на 98,13 проц. З кожным месяцам падае лік зрываў спаранай. Колькасьць паўторнасьцяй рамонту ў верасьні складала 48.

Аздараўленьне паравознай гаспадаркі дало магчымасьць значна ўзьняць барацьбу за выкананьне ўсіх вымернікаў. Так, сьледваньне цягнікоў па раскладзе ў сярэднім складае 80 проц., па вузлах даходзіць да 100. Няма тэй вялікай колькасьці спыненьняў у дарозе, што былі раней. Здаровая паравозная гаспадарка аздараўляе і работу аддзелу руху. Імена таму Жлобінскі вузел быў прэм'яваны на ўсесаюзным конкурсе ў 50.000 руб. за бліскучае выкананьне эксплёатацыйных вымернікаў.

Пачэснае месца ва ўсесаюзным спаборніцтве лепшых спараных брыгад заняла брыгада Яжонкі і Ісаева (Ма-

Памочнік машыніста тав. Казлоў, які атрымаў на ўсебеларускім конкурсе 2 месца на эканоміі апалу.

гілёў), на ўсебеларускім—Зялёнка і Хохаў. Па-ўдарнаму змагаюцца за лепшыя вымернікі жлобінскія паравозьнікі Вігдорчык і Сенажэнскі.

Работу па ўмацненьні паравознай гаспадаркі трэба ўзмацніць яшчэ больш. Лепшыя паравозьнікі павінны ўключыцца ў другі ўсебеларускі конкурс лепшых спараных брыгад. У гэты конкурс павінны быць уключаны і тыя машыністы, якія ў першым конкурсе дамагліся найвялікшых вынікаў сваёй работы. Зараз перад імі задача—перакрыць дасягнутыя посьпехі, узяць шэфства над адстаючымі машыністамі і дамагацца агульнай перамогі.

Ташын.

Сэкцыя разгортвае работу на вузьле

Транспартная сэкцыя Гомельскага гарсавету разгортвае работу па выкананьні ўзятых абавязкаў у парадку спаборніцтва з дэпутацкай групай Віцебскага чыгуначнага вузла. На працягу студзеня сэкцыя абмеркавала рад гаспадарчых пытаньняў, вырашэньне якіх было накіравана на ажыцьцяўленьне 6 паказаньняў тав. Сталіна і загаду наркома тав. Андрэева.

На сваім паседжаньні бюро сэкцыі абгаварвала пытаньне сьнегабарацьбы і прапанавала практычныя мерапрыемствы для 5 экспляатацыйнага раёну. Правядзеньне масавай растлумачальнай работы ў калгасах дапамагло мабілізаваць рабочую і гужавую сілу на час сьнегабарацьбы. Была забясьпечана патрэбная колькасьць вагонаў і паравозаў для ачысткі і вывазкі сьнегу. Раённае ТСТ своечасова забясьпечыла сьнеданьнямі і прадуктамі рабочых, занятых па ачыстцы сьнегу. У выніку ўсіх гэтых мерапрыемстваў на дарозе ня было прастояў ад заносаў.

Сэкцыя ўлічыла ўсе недахопы, якія тармозяць работу на транспарце. Для палепшаньня работы манэўровых дыспэтчароў на вузьле, сэкцыя ўжывае захады, каб устанавіць неабходную сувязь па раёне, каб ліквідаваць тыя перашкоды, якія маюцца ў фармаваньні цягнікоў.

Зараз перад сэкцыяй стаяць яшчэ больш адказныя абавязкі. Сэкцыя павінна прыняць меры і праз сваю дэпутацкую групу на вузьле абавязана змагацца з абязьлічкай, з ураўнілаўкай, за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку.

Бюро транспартнай сэкцыі распрацоўвае мерапрыемствы па праверцы ўсіх тых абавязкаў, якія сэкцыя ўзяла на ўсесаюзнай пераклічцы — спаборніцтве на транспарце.

С. Лапін.

ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ ПРЫ САВЕТАХ
ПАВІННЫ БЫЦЬ АРГАНІЗУЮЧЫМ І КІРУЮЧЫМ ЦЭНТРАМ БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДА 3-Й БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ

Апэрацыйна кіраваць работай саветаў

Важнейшымі задачамі саветаў у падрыхтоўцы да веснавой пасеўкампаніі зьяўляюцца: правільная арганізацыя працы ў калгасах, своечасовае стварэньне насенных і страхавых фондаў своечасовы рамонт машын і с.-г. інвэнтару, правядзеньне ў жыцьцё ўсіх мерапрыемстваў, забясьпечваючых узьняцьцё ўраджайнасьці, своечасовае правядзеньне работы па аддзе зямель і інш.

У аснову гэтай работы бязумоўна павінна быць пакладзена выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Імена ад таго наколькі своечасова і правільна гэтыя мерапрыемствы будуць праведзены ў жыцьцё—будзе залежыць пасьпяховая падрыхтоўка і самае правядзеньне 3-й бальшавіцкай сяўбы.

Таму ад партыйных ячэек пры саветах зараз патрабуецца асабліва ўзмоцненае кіраўніцтва саветамі ў іх рабоце па падрыхтоўцы да сяўбы.

Зьмяшчаемы сёньня матар'ял аб рабоце партыйных ячэек пры саветах у галіне кіраўніцтва імі падрыхтоўкай да сяўбы, гаворыць аб тым, што ў гэтым напрамку ў нас ня ўсё здавальняюча. Калі допіс з Менску паказвае прыклад жывога кіраўніцтва партыйнай ячэйкі гарсавету падрыхтоўкай да сяўбы, дык Рудзенская партыйная ячэйка гэтым пытаньнем амаль не займаецца.

І адсюль вывад: у Менскім прыгарадным раёне падрыхтоўка да сяўбы ў разгары; у Рудзенскім сельсавеце яшчэ ня створаны насенфонды, машыны і інвэнтар не рамантуюцца, калгасы не забясьпечаны ўгнаеньнем, у калгасах няма яшчэ нават вытворчых плянаў.

Гэтае становішча настойліва патрабуе ад адстаючых ячэек карэннага пералому ў галіне іх кіраўніцтва саветамі. Трэба дамагчыся таго, каб увесь цяжар работы па падрыхтоўцы да сяўбы быў перакладзены на сэкцыі пры саветах. Сэкцыя сац. земляробства павінна ўзяць на сябе кіраўніцтва ўсімі гаспадарчымі работамі ў калгасах, сэкцыя РСІ—правяраць своечасовае выкананьне пастаноў партыі і ўраду.

Вакол сэкцый павінен быць згуртаваны сталы актыў, на які сельсаветы і партячэйка маглі-б абапірацца пры правядзеньні ўсіх важнейшых мерапрыемстваў. Вялікую ролю ў выхаваньні гэтага актыву адыгрываюць партыйныя школы і нізавы друк. Таму першачарговай задачай партыйных ячэек пры саветах зьяўляецца палепшаньне работы партыйных школ і палепшаньне кіраўніцтва нізавым друкам і рабсельнкорамі.

Работа партыйных ячэек пры саветах будзе ацэньвацца ў залежнасьці ад таго, наколькі яны здолеюць забясьпечыць бальшавіцкія тэмпы работы саветаў па падрыхтоўцы да сяўбы, ад пасьпяховай падрыхтоўкі і самага правядзеньня сяўбы.

Партячэйка Менскага гарсавету канкрэтна кіруе падрыхтоўкай да сяўбы

Сьнежаньскі пленум Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б паставіў перад партарганізацыяй баявую задачу—у 1932 годзе дамагчыся таго, каб прыгарадны раён цалкам забясьпечваў Менск гароднінай і малочнымі прадуктамі. У выкананьне гэтай баявой задачы Менскі прыгарадны раён ператвараецца з раёну збожжавых культур у раён культур гародных. У 1930 годзе плошча пад гародамі займала 1.265 га і пад бульбай — 6.673 га. У 1931 годзе плошча пад гародамі павялічылася да 2.457 га і пад бульбай — 9.197 га. У веснавую пасеўкампанію 1932 году мяркуецца пад гародамі заняць 5.000 га і пад бульбай — 15.400 га.

Баявая задача перабудовы твару раёну ў веснавую пасеўкампанію 1932 году патрабуе ад Менскай партарганізацыі ў цэлым і ад партыйнай ячэйкі Менскага гарадзкога савету ў прыватнасьці, напружаньня ўсіх сіл, мабілізацыі ўсёй увагі.

Ячэйка КП(б)Б Менскага гарсавету правільна зразумела пастаўленую перад ёю задачу і пытаньнем падрыхтоўкі да бальшавіцкай вясны занялася своечасова. У студзені месяцы на адкрытым сходзе ячэйкі быў заслуханы даклад загадчыка зямельнага аддзелу гарсавету аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. У спрэчках было выяўлена, што кіраўніцтва калгасамі з боку райкалгассаюзу нездавальняючае, у выніку чаго ў значнай частцы калгасаў не ліквідаваны абязьлічка і ўраўнілаўка. Пераход на зьдзельшчыну па многіх калгасах праведзены фармальна. Вывазка ўгнаеньня і попелу на палёх праводзіцца марудным тэмпамі.

Асабліва дрэнна абстаіць справа са складаньнем вытворчых плянаў. Пляны сяўбы да кожнага сельсавету, саўгасу і калгасу даведзены своечасова, але-ж вытворчыя пляны па большасьці калгасаў яшчэ ня складзены. Між тым ад вытворчых плянаў залежыць ня толькі пасьпяховае правядзеньне сяўбы, але і выяўленьне лішкаў рабочай сілы для больш рацыянальнага іх выкарыстаньня.

Для ліквідацыі гэтых прарываў ячэйка пастанавіла мабілізаваць спэцыялістаў гарадзкіх і цэнтральных устаноў і накіраваць іх у калгасы. Мабілізаваным таварышом даручана дапамагчы калгасам скласьці вытворчыя пляны. **У аснову гэтай работы пакладзена практычнае правядзеньне ў жыцьцё апошняй пастановы ЦК УсеКП(б) аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў.**

Але трэба адзначыць, што некаторыя ўстановы па - дзяляцку аднесьліся да мабілізацыі спэцыялістаў і затрымліваюць іх, не даюць ім магчымасьці выехаць у калгасы.

Падагуліўшы папярэднія вынікі падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, ячэйка КП(б)Б гарсавету вызначыла рад далейшых канкрэтных мерапрыемстваў па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў і фарсаваньні падрыхтоўчых работ. Пастаноўлена: 1) малацьбу зярнёвых у калгасах і саўгасах закончыць да 20-II; пасеннай канюшыны — да 1-III; 2) правесьці ачыстку ўсіх зярнёвых культур; 3) цалкам закончыць рамонт с. г. інвэнтара да 1 сакавіка; 4) вывазку ўгнаеньня закончыць да 1 красавіка; 5) сыстэматычна правяраць якаснае захаваньне насенных фондаў.

Падрыхтоўка ў разгары. Зараз першачарговай задачай партячэйкі гарсавету зьяўляецца правільна наладжаны кантроль за выкананьнем пастаноў, апэрацыйнае кіраўніцтва ўсёй падрыхтоўкай. Ад гэтага будзе залежыць пасьпяховае правядзеньне 3-й бальшавіцкай.

Г. Баброўскі

Рудзенская партячэйка пытаньнямі сяўбы яшчэ не займаецца

Пухавічы. Справа з падрыхтоўкай да веснавой пасеўнай кампаніі ў Рудзенскім сельсавеце абстаіць зусім дрэнна. На сёньняшні дзень сельсавет ня мае яшчэ нават пляну веснавой сяўбы і падрыхтоўчая работа амаль не пачата.

Старшыня сельсавету тав. Ульман тлумачыць сваю бязьдзейнасьць выключна адсутнасьцю плянаў, у той час калі можна пачаць падрыхтоўку без раённага пляну.

У Рудзенску на складзе яшчэ з восені ляжыць каля 160 тон мінэральных угнаеньняў. Але ніводзін з 8 старшынь калгасаў не бярэ гэтага ўгнаеньня зараз, а чакаюць пачатку сяўбы. Рудзенская партыйная ячэйка пытаньнямі падрыхтоўкі да сяўбы не займаецца. Апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) аб гаспадарчым умацаваньні калгасаў і пастанова Калгасцэнтру СССР і РСФСР сярод савецкага і калгаснага актыву не распрацавана, не гаворачы ўжо аб канкрэтным правядзеньні іх у жыцьцё.

Пухавіцкі РК КП(б)Б павінен папярэдзіць зрыў падрыхтоўчых работ да сяўбы па Рудзенскім савеце.

М. Д.

Менгарком КП(б)Б разам з паўпрэдствам рэдакцыі „Праўда“ па БССР

склікае агульна-гарадзкую нараду

ўпаўнаважаных па масавай рабоце з ЦО партыі „Праўда“ па пытаньнях:

а) разгортваньня масавай работы ў сувязі з лімітацыяй тыражу „Праўды“ (Даклад тав. Ба[illegible]ўск[illegible]);
б) аб дастаўцы „Праўды“ і яе выдачы падпісчыкам (даклад т. Кракоўскі);
в) інфармацыя з месц.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні гаркому, 3-ці паверх, зала пасяджэньняў 21 лютага, роўна а 6 гадз. вечара.

На нараду таксама абавязкова павінны з'явіцца і ўпаўнаважаныя па партдруку і [illegible]ўпаўнаважаныя.

Менгарком КП(б)Б

М. Лынькоў

Ліст тав. Сталіна і задачы беларускай пралетарскай літаратуры

Яшчэ на першай канфэрэнцыі МенАПП'у мы гаварылі аб задачах, якія ставяцца перад пралетарскай літаратурай у сувязі з лістом т. Сталіна. Але да гэтага часу арганізацыя МенАПП'у не зрабіла належных канкрэтных вывадаў з указаньняў т. Сталіна, яшчэ не паклала іх у аснову сваёй штодзённай практычнай работы, сваёй барацьбы за пралетарскую літаратуру, за яе гегемонію.

Разгортваньне творчай дыскусіі дапаможа нам намеціць далейшыя шляхі нашага росту, дапаможа ў распрацоўцы і ўдасканаленьні творчага мэтаду пралетарскай літаратуры. Мы, ні ў якім разе не павінны адрываць нашу літаратуру ад агульных задач сацыялістычнага будаўніцтва, не павінны замыкацца ў вузкае кола літаратурнай спэцыфікі. Пралетарскі пісьменьнік ня можа ня бачыць той шчыльнай і непарушнай сувязі між ростам і разьвіцьцём літаратуры з усім тым, што адбываецца ў нашай краіне, з яе эканомікай, з яе велізарнымі посьпехамі і дасягненьнямі на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, ня можа ня ўлічваць і таго, што робіцца за рубяжом, у варожых капіталістычных краінах.

Нядаўна закончыла сваю работу XVII Усесаюзная канфэрэнцыя УсеКП(б). Канфэрэнцыя адбылася на гістарычным рубяжы: краіна завяршыла пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі, уступіла ў чацьвёрты завяршаючы год пяцігодкі, пад кіраўніцтвам партыі прыступіла да намёткі плянаў другой пяцігодкі. Адным з асноўных вынікаў першай пяцігодкі зьяўляецца тое, што—«Савецкі Саюз з краіны дробнага і драбнейшага земляробства ператварыўся ў краіну самага буйнага ў сьвеце земляробства на аснове калектывізацыі, разгортваньня саўгасаў і шырокага ўжываньня машыннай тэхнікі. Гэта перамога сацыялізму, якая рашае самую важную і самую трудную задачу пралетарскай рэвалюцыі, мае сусьветна-гістарычнае значэньне». (З рэзалюцыі па дакладах т. т. **Молатава і Куйбышава** на XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі).

XVII партканфэрэнцыя ўказала, што асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі «зьяўляецца канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне прычын, спараджаючых клясавую розьніцу і эксплёатацыю і перамаганьне перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавай, сацыялістычнай грамады».

Даволі прывесьці такія лічбы, як пуск 24 новых доменных пячэй, выпуск 82.000 трактароў, 73.000 аўтамабіляў, 1.300 паравозаў, 50.000 таварных вагонаў, арганізацыя новых 1.700 машынна-трактарных станцый, выпуск новых машын на 6,8 мільярдаў рублёў, выраб 17 мільярдаў кілёват-гадзін электраэнэргіі і г. д., і г. д.—гэта толькі лічбы таго, за што мы змагаемся ў 1932 годзе,—каб зразумець усю грандыёзнасьць нашага будаўніцтва, ні з чым непараўнальных і ня маючых прыкладаў у гісторыі тэмпаў гэтага будаўніцтва, тэмпаў пераробкі былой жабрацкай, дзікай, някультурнай краіны ў перадавую краіну ў сьвеце. Вынікі першай пяцігодкі даюць поўныя падставы і ўпэўненасьць і ў пасьпяховым выкананьні плянаў другой пяцігодкі, упэўненасьць у тым, што Савецкі Саюз у другой пяцігодцы займе першае месца ў Эўропе і ў тэхнічных адносінах.

КАПІТАЛІЗМ НАПЯРЭДАДНІ КРУШЭНЬНЯ

На фоне нашых перамог, на фоне нашых велізарнейшых дасягненьняў яшчэ яскравей выступае немінучасьць крушэньня варожай нам капіталістычнай сыстэмы, немінучасьць гібелі капіталістычнага ладу, з большай сілай праяўляюцца яўныя адзнакі разлажэньня, загніваньня старой, эксплёататарскай, якая парабошчвае мільёны людзей, культуры. Усе капіталістычныя краіны, перажываюць зараз глыбокі эканамічны крызіс, які падрывае векавыя ўстоі барбарскай цывілізацыі, векавыя ўстоі буржуазнага дабрабыту, буржуазнай маралі і г. д.

Побач з эканамічным заняпадам, з крахам банкаў, банкруцтвам розных буйнейшых трэстаў і сындыкатаў, побач з закрыцьцем фабрык і заводаў (за выключэньнем, зразумела, ваеннай прамысловасьці, для якой наступілі зараз «наилучшие времена» ў Эўропе), мы наглядаем і заняпад культуры, духоўнае і маральнае разлажэньне пануючых клясаў, рэгрэс за ўсіх галінах культурнага жыцьця, рэгрэс літаратуры, мастацтва. Гэты заняпад закрануў нават і такую галіну як тэхніку, як тэхнічную вынаходлівасьць думку. Мы сустракаемся там нават са спробамі «філёзофскі» абаснаваць пагібальнае значэньне тэхнікі для сусьветнай цывілізацыі, патрэбнасьць павярнуць цывілізаваныя народы назад —далей ад чыгунак, параходаў, самалётаў, электрыкі,—«на лона першабытнай грамады». Ня рэдкасьць сустрэць там прафэсара, які спрабуе сумяшчаць такія-б, здаецца, несумяшчальныя рэчы, як фізыка, хімія і... сьпірытызм, матэматыка, і... вызываньне духоў, тэорыя паходжаньня відаў і... тэорыя «пробоения ребра господня» і ўплывы гэтай «тэорыі» на... амэрыканскую архітэктуру. Тысячы тэхнікаў, інжынэраў знаходзяцца зараз без работы. Ня толькі ў такіх маленькіх краінах, як прыбалтыцкія, але і ў Нямеччыне. Там-жа скарачаюцца школы, павялічваюцца штаты беспрацоўнай інтэлігенцыі, беспрацоўных дактароў, адвакатаў, настаўнікаў (успомнім тут хаця-бы той славуты ліст ад нямецкай камунальнай работніцы—былой студэнткі да савецкай студэнткі—былой, камунальнай работніцы). Француская мастакі прадаюць свае карціны на парыскіх вуліцах за гарачы булыбы, латвійскія беспрацоўныя інжынэры і тэхнікі просяць свой буржуазны ўрад арганізаваць грамадзкія работы, дзе-б яны змаглі зарабіць на кавалак хлеба, працуючы ў якасьці звычайных чорнарабочых.

АБ ЛІТАРАТУРЫ, «КОЧЕНЕЮЩЕЙ НА ХОЛОДНОМ ЛОЖЕ».

Асабліва ў капіталістычных краінах адчуваецца маральнае разлажэньне, духоўны холад на такім ідэалёгічным участку, як буржуазная літаратура. Апалёгетыка самых рэакцыйных, самых брыдкіх, нічым не прыкрытых зьвярыных інстынктаў буржуазіі, ужываньне самай нахабнай ідэалёгічнай дэмагогіі, па прыкладу палітычнай дэмагогіі. Успомнім хаця-б варшаўскі фарс—камэдыю суда, арганізаванага фашысцкім польскім урадам над сваімі-ж лёкаямі—блёкам «Цэнтралевых»—блёкам кулацкіх і сацыял-фашысцкіх партый Польшчы, нічым не замаскаванае апяваньне шыбеніцы, кнута і кулямёта—гэта адзін бок мэдалі. З другога боку альбо порнаграфія, скразная паталёгія, альбо поўная безнадзейнасьць, бязысходнасьць, біспэрспэктыўнасьць, адход у містыку, у загробны сьвет, спадзяваньні на сьмерць, як на адзіную збавіцельніцу ад такіх непрыемных рэчаў, як жорсткі эканамічны крызіс, стварэньне паміж жыцьцём і сьмерцю сваясаблівага містычнага равенства.

«Всё исчезает как дым, как сон,
Даже с камней сотрется след
Этих темных и злых времён,
Этих страшных и долгих лет».

Так «вещает» поэт з буржуазнага і белагвардзейскага лягеру, спадзяваючыся на сьмерць, што

«Она одна сумеет всем помочь,
Она одна сумеет всё поправить».

Яму-ж угорыць другі «зещий баян» з таго-ж самага лягеру:

...«жизнь земную—в смертный час
Мы, коченея на холодном ложе,
Смежая веки изумленных глаз
Ни вспомнить, ни понять не сможем».

Найбольш яскравым паказьнікам маральнага разлажэньня зьяўляецца імена белагвардзейская густапсовая літаратура—нацыянальная ідэй сусьветнай контр-рэвалюцыі, гэта губка, якая ўбірае ў сябе ўвесь бруд, усю гніль, усе міязмы зажыва гніючага капіталістычнага трупа. Да чаго ўжо неразборлівы белагвардзейскія чытачы, але і яны часам спрабуюць абурацца супроць ужо залішне праўдзівых апісаньняў іх літаратурных пісак, апісаньняў жыцьця самой эміграцыі. Так, адзін з белагвардзейскіх рэцэнзентаў абураецца супроць раману «Парабола» нейкага В. С. Яноўскага.

«Яноўскаму зачымсьці трэба было зрабіць сваіх герояў рускімі эмігрантамі. Гэта зусім беспадстаўна, бо гнілыя рубы, хворыя і брудныя цела, ідыёты, паралітыкі, палавыя ізвраднічэнцы існуюць паўсюды...».

Ён-жа абураецца прыблізна аб гэтае-ж самае і на другога эмігранцкага раманіста С. Комарава (раман «Вясёлае жыцьцё»). Варта было-б напомніць абуранаму рэцэнзенту адну з баек Крылова аб люстры і малпе, аб крывой «рожы» і іншых такіх рэчах. Але ніхем пратухлую белагвардзейскую падваротню, ня варта добра займацца ёй.

Мы прывялі ўсе гэтыя прыклады, як найбольш яскравыя ілюстрацыі заняпаду, дэградацыі буржуазнай культуры. І ня дзіва, што ў той час, калі перад намі разгортваюцца грандыёзныя пэрспэктывы далейшага росту і росквіту адзінай у сьвеце дзяржавы працоўных; калі перад намі ў магутным поступе і подыху тысяч новых машын, тысяч новых фабрык, заводаў, шахтаў устае і новы чалавек—у мінулым раб—а сёньня, заўтра актыўны сьвядомы будаўнік сацыялізму; калі перад намі ўсё больш выразьней, усё больш бліжэй выступаюць рысы сусьветнай рэвалюцыі; калі над намі пануе радасьць будаўніцтва,—ня дзіва, што ў гэты час капіталістычны сьвет спрабуе істэрычна крычаць перадавіцамі і аншлагамі сваіх газэт:—«Ці ня гіне сьвет».

АБ «РУЦЭ БОЖЫЯЙ», «РУЦЭ ДОБРАЙ ЦЁЦІ ФРАНЧЭСКІ» і «ЦЬВЁРДАЙ РУЦЭ ЎРАДУ»

Эканамічны крызіс, зоалёгічны страх перад узрастаючай рэвалюцыйнай хваляй прымушаюць некаторыя капіталістычныя мазгі да форменнага затлуменьня і атупеньня. Прагнозамі эканамічнага крызісу, прадраканьнямі яго канца займаюцца зараз усякія варажбіткі, нумэралёгі, астралёгі, накшталт Мак-Кукіша (успомніце рад фактаў, прыведзеных тав. Молатавым у дакладзе на Ўсесаюзнай партканфэрэнцыі). Вядома, акрамя розных Кукішаў, прагнозамі эканамічнага крызісу займаюцца і «дзяржаўныя мужы» розных краін. У адной з зарубежных газэт мы напаткалі гэтымі днямі рад інтэрв'ю з выдатнейшымі палітычнымі дзеячамі Польшчы, Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі і г. д. Інтэрв'ю ўсё на адну і тую-ж тэму:

«Ці ня гіне сьвет?». Малюючы самымі чорнымі фарбамі сучаснасьць, эканоміку, узрастаючы крызіс, яны спрабуюць рабіць прагнозы, як выбрацца з біды, але ў гэтых прагнозах—ня так ужо і далёка ад кукішаўскіх прадраканьняў,—дастойныя мужы ня могуць дастойных дзяржаў ня ідуць далей такіх глыбакадумных цьвярджэньняў, што ўсё, напрыклад—

«у руцэ божыяй
па другое
«і ў руцэ добрай цёці Францэскі»
і па трэцяе —
«у цьвёрдай руцэ ўраду», у цьвёрдай руцэ, узброенай галунамі, узброенай кольтамі, кулямётамі, добра [illegible] еўропскай. Бог, франк, кулямёт,—тры кіты нашых бліжэйшых суседзяй, тры «столпа» дзяржаўнага дабрабыту. Першы «стол», праўда, задужка ўжо апляшывеў, другі хоць і аддае яшчэ чыстым залатым звонам, але-ж «пути господни неисповедимы»—быў такі англейскі фунт, да і той сфунціўся,—таму і маем яўныя прызнакі выключнай увагі і пашаны да кулямёта, да пяньковай вяроўкі.

Дэфэнзывы, сыгуранцы больш за ўсіх стараюцца паказаць на канкрэтных прыкладах гэтую выключную ўвагу і пашану. Ды і чаго баяцца? Хіба ня знойдзецца такі японскі дэлегат Сато, які апраўдае перад Лігай нацый любую польскую пацыфікацыю, тым больш, што і яснавяльможная Польшча з замілаваньнем, з выключным «сердечным трепетом» і з звычайным абліззваньнем пазірае японскія «пацыфікацыйныя» дзяржаўныя «практыкаваньні» ў Карэі, у Маньчжурыі, у Шанхаі.

І ня дзіва, што нават вынаходніцкая тэхнічная думка за рубяжом працуе імена ў выключнай прыязьні да гэтага самага кулямёта. Мы маем інфармацыю аб вынаходніцтве «выключнай па сваёй моцы» бронябойнай кулі адным нямецкім інжынэрам, якая па думцы буржуазнай прэсы робіць пераварот у бронявой справе.

Як-жа тэхніка праяўляе сябе ў дачыненьні да мірнай справы, да гаспадаркі, да прамысловасьці? Апошнімі днямі ў нашых суседзяй выяўлены патэнты на вынаходніцтва спэцыяльных апаратаў па... «папярэджаньні храпа» і яшчэ на нешта нейкае, накшталт «апарату па лоўлі блох». Мы ні ў якім разе ня схільны недаацэньваць буржуазную тэхніку і зводзіць яе выключна да антыхрапавых функцый, але-ж цэлы рад паказальнікаў (і тым, што прыводзіцца вышэй) гавораць аб яе заняпадзе, альбо пераварэньні ў вернага служаку хціўага імпэрыялізму.

Ясна, што капіталісты ўсімі сіламі стараюцца знайсьці выхад з тупіка, у які яны апынуліся з прычыны жорсткага эканамічнага крызісу, узрастаньня рэвалюцыйнага руху сярод шырокіх працоўных мас. Гэты выхад яны шукаюць (і ня толькі шукаюць, але прымаюцца і за канкрэтныя справы) у нападзе на другія краіны, у вайне, у арганізацыі інтэрвенцыі супроць Савецкага Саюзу. Чым больш абвастраецца крызіс, чым больш абвастраюцца капіталістычныя супярэчнасьці, чым больш разьвіваецца рэвалюцыйная хваля, чым больш мацнее Савецкі Саюз—тым больш расьце непрымірымая клясавая ненавісьць да нашай краіны — крэпасьці сусьветнай рэвалюцыі.

ЛІСТ тав. СТАЛІНА—ЗАКЛІК ДА ВЫКЛЮЧНАЙ КЛЯСАВАЙ ПІЛЬНАСЬЦІ

У сьвеце тых грандыёзных кантрастаў у эканаміцы, культуры двух процілеглых, непрымірымых грамадзкіх сыстэм, у сьвеце той непрымірымай ненавісьці лягеру сусьветнай рэакцыі да лягеру сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, у сьвеце тых велізарных задач, якія ставяцца зараз перад нашай краінай мы і разглядаем ліст тав. Сталіна ў часопіс «Пралетарская Рэвалюцыя», ліст «Аб некаторых пытаньнях бальшавізма».

Асноўная ўстаноўка ліста—заклік да партыі да выключнай клясавай пільнасьці супроць усякіх шкодных і варожых тэорый, уплываў, ідэй і ідэяк, заклік да падвышэньня клясавай дбайнасьці на ўсіх франтох нашага будаўніцтва, да выключнага адзінства ў нашых кроках, якое так патрэбна ў нашай гіганцкай рабоце, у гіганцкай барацьбе.

Па-першае, ліст тав. Сталіна дае ясную і вычарпальную ацэнку трацкізму —перадавому атраду контррэвалюцыйнай буржуазіі. Па другое, ліст тав. Сталіна папярэджвае партыю аб працягваньні ўсякай трацкісцкай кантрабанды, аб наяўнасьці ўсякіх «тэарэтыкаў» і «гісторыкаў», якія скажаюць гістарычную сапраўднасьць, узводзяць паклёпы на нашу партыю, на яе арганізатара т. Леніна. Ліст указаў, па якіх пытаньнях, па якой лініі ідзе тэтая кантрабанда. Ліст даў выразную характарыстыку люксэмбургіянству, сьцяг якога трацкісты спрабуюць ськарыстаць для прыкрыцьця сваёй кантрабанды. Тав. Сталін указаў і на наяўнасьць гнілога лібэралізму з боку па асобных членаў партыі. «Есьць людзі, якія й зараз думаюць, што трацкізм ёсьць фракцыя камунізму, якая, праўда, памыляецца, робіць глупствы, часам антысавецкія глупствы, але ўсё-ж фракцыя камунізму». Тав. Сталін указаў, што паколькі гістарычная канцэпцыя трацкізму самым цесным парадкам зьвязана з самымі актуальнымі пытаньнямі сучаснасьці, паколькі тэорыя «перманэнтнай рэвалюцыі» ўключае ў сябе адмаўленьне магчымасьці пабудовы сацыялізму ў адной краіне, то прапагандаваць трацкізм—ён толькі прапагандаваць меншавіцкія погляды на падзеі, але і рыхтаваць глебу для разгортваньня барацьбы супроць партыі і яе генэральнай лініі на разьвіцьцё высокіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Выкрыўшы карэньні трацкізму і яго контррэвалюцыйную сутнасьць, выкрыўшы прычыны скарыстаньня трацкістамі сьцягу люксэмбургіянства для маскіраваньня сваёй кантрабанды, і выявіўшы асноўныя палітычныя памылкі самага люксэмбургіянства (роля ў палеміцы з меншавікамі аб характары нашай партыі, сааўтарства Розы Люксэмбург з Троцкім у тэорыі «перманэнтнай рэвалюцыі», паўменшавіцкая тэорыя Розы Люксэмбург аб немінучасьці аўтаматычнага краху капіталізму, выступленьні яе супроць [illegible] вызначэньня нацый), тав. Сталін [illegible]

Культжылзбор—у цэнтр увагі фінпаходу

За пасьпяховае правядзеньне культжылзбору

Для забесьпячэньня пляну гаспадарчага і культурнага будаўніцтва вёскі, для паляпшэньня культурна-матэрыяльнага становішча рабочых і калгасьнікаў зьяўляецца неабходным, побач са значнымі ўкладаньнямі па лініі дзяржавы, прыцягнуць на гэтую справу сродкі насельніцтва.

Адсюль мае выключна важнае значэньне своечасовае спагнаньне, уведзенага па прыкладзе мінулага году культжылзбору.

Гэтая кампанія павінна ўжо была быць на поўным ходу. Але на сёньняшні дзень яна разгортваецца на месцах надзвычайна маруднымі тэмпамі.

Паводле вестак Наркамфіну БССР, лічэ толькі 29 раёнаў прыступілі да ажыцьцяўленьня пастановы ўраду СССР і БССР аб зборы на культурна-жыльлёвае будаўніцтва.

Да перадавых раёнаў адносяцца Сіроцінскі, Магілеўскі, Чырвонаслабоцкі, Расонскі, Мсьціслаўскі, Гомельскі, Віцебскі і інш.

Рад раёнаў да гэтага часу абсалютна нічога ня робяць па гэтай кампаніі. Так, напрыклад, у Жлобінскім раёне нават яшчэ не прыступілі да работы па налічэньні культжылзбору.

Маруднымі тэмпамі разгортваецца гэтая кампанія і па Менскім раёне. На 14-га лютага з налічанай сумы вёскі паступіла ўсяго толькі 6 проц. Гэта ў той час, калі да 15-га лютага павінна было паступіць ня менш 50 проц. налічанай сумы.

Усім партыйным, савецкім прафсаюзным арганізацыям трэба зараз-жа па-бальшавіцку ўзяцца за правядзеньне гэтай кампаніі. Дэталёва растлумачыць працоўнаму насельніцтву аб мэтах і задач культжылзбору, своечасова правесьці налічэньне і на аснове шырокага разгортваньня сацспаборніцтва паміж паасобнымі паселішчамі, калгасамі, сельсаветамі, дамагчыся пасьпяховага правядзеньня гэтай кампаніі.

З фронту правядзеньня культжылзбору

Гомель. (Белта). Пастанова ўраду аб аднаразовым зборы на культурнае і жыльлёвае будаўніцтва, ужо даведзена да кожнага паселішча. 23 адказных работнікі раёну камандыраваны на месцы для правядзеньня растлумачальнай работы сярод працоўнага насельніцтва аб мэтах і задачах збору.

Працоўнае насельніцтва цалкам ухваляе пастанову ўраду аб культзборы. Асабліва ўдарна працуюць перадавыя сельсаветы раёну. Прыборскі і іншыя сельсаветы ўжо скончылі налічэньні культзбору і ўручылі платнікам паведамленьні.

Віцебск. (Белта). Нарада старшынь сельсаветаў раёну абавязалася правесьці кампанію па культзборы па-ўдарнаму, шырока разгортваючы сацыялістычныя мэтады работы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Паміж паасобнымі сельсаветамі заключаны сацдагаворы, дзе высунуты пункты аб лепшым ажыцьцяўленьні закону аб культзборы, а таксама аб датэрміновым выкананьні пляну культзбору.

Лагінскі сельсавет першым давёў да ўсіх калгасьнікаў, сялян аднаасобнікаў і кулацка-заможных гаспадарак паведамленьні аб культзборы. Праведзены сходы аб значэньні культзбору. Вылучаны брыгады, якія прыступілі да збору налічаных плацяжоў.

Неадкладна спагнаць запазычанасьць з кулацка заможных гаспадарак

Паводле даных НКФіну БССР, па многіх раёнах дагэтуль не ліквідавана запазычанасьць па абавязковых плацяжох на вёсцы.

Кулацкія гаспадаркі здалі толькі 84 проц. індывідуальнага абкладаньня.

Цалкам сабраны с.-г. падатак толькі па 20 раёнах. Асабліва добра правялі работу Асіповіцкі, Быхаўскі і Сіроцінскі раёны.

Ганебна адстаюць Чырвонапольскі раён, які да 1 лютага спагнаў з кулакоў толькі 47,3 проц. заданьня па індывідуальным абкладаньні, і Гарадоцкі—54,4 проц.

Заданьне па страхоўцы на 1931 г. цалкам спагнана з кулацка-заможных гаспадарак толькі па 28 раёнах. Ёсьць раёны, як напрыклад, Расьнянскі і Лельчыцкі, якія дагэтуль спагналі запазычанасьць па страхоўцы з кулацка-заможных гаспадарак толькі на 29,5 проц. і 53,8 проц.

Амаль гэткае-ж становішча і са спагнаньнем па самаабкладаньні. У той час, калі Быхаўскі, Сіроцінскі і Тураўскі раёны цалкам спагналі самаабкладаньне, Брагінскі, Карлянскі і Чачэрскі раёны да апошняга часу ў лік запазычанасьці па самаабкладаньні нічога не спагналі.

Гэткае становішча са спагнаньнем абавязковых плацяжоў з кулацка-заможных гаспадарак у адстаючых раёнах зьяўляецца вынікам апартуністычнага патураньня кулаку. Гэткае становішча надалей недапусьціма. Раённыя арганізацыі павінны ў бліжэйшыя дні спагнаць запазычанасьць з кулацка-заможных гаспадарак.

У Крупскім раёне акцыі Трактарацэнтру рэалізуюць чарапашнымі тэмпамі

На Крупскім раёне рэалізацыя акцый Трактарацэнтру праходзіць чарапашнымі тэмпамі. Заданьне 1 кварталу 1932 году выканана ўсяго на 9,1 проц. Рад сельсаветаў справе рэалізацыі акцый Трактарацэнтру не надалі належнай увагі (Шэйскі, Ігрушацкі, Грыцькаўскі, Хацюхоўскі і г. д.). Такое выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў на будаўніцтва МТС гаворыць за тое, што план гэтага будаўніцтва ў раёне знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Раённым арганізацыям трэба безадкладна мабілізаваць увагу ўсёй грамадзкасьці, партыйнага і камсамольскага актыву на выкананьне пляну рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

М. Іваноў

Наступленьне японскага імпэрыялізму ў Кітаі

Акупацыя Харбіна азначае завяршэньне адной з асноўных мэтаў японскага імпэрыялізму—ператварэньне Манчжурыі ў японскую калёнію.

Для японскага імпэрыялізму захоп Манчжурыі прадстаўляе сапраўды вельмі каштоўнае значэньне.

Японскі імпэрыялізм становіць сабою гіганта на гліняных нагах. Сапраўды, Японія зьяўляецца краінай, дзе пануе фінансавы капітал, дзе канцэнтрацыя капіталу дасягнула вельмі высокай ступені. Гэта—краіна з высока разьвітай цяжкай і лёгкай прамысловасьцю, з разгалінаванай сыстэмай чыгунак, з вялізарным марскім транспартам і г. д., коратка гаворачы, гэта адна з перадавых капіталістычных краін.

І адначасова, Японія ня мае тых асноўных элемэнтаў прыроднага і грамадзкага парадку, без якіх ня можа існаваць сучасная капіталістычная гаспадарка. Японія не ўладае ўласнымі жалезнымі руднікамі, месцанараджэньнямі нафты і г. д. Вугальныя запасы Японіі вельмі абмежаваны і амаль адсутнічаюць коксуючыяся вуглі—база сучаснай мэталюргіі. Японія не разводзіць бавоўны. Нават значную частку харчовых прадуктаў японскі імпэрыялізм прымушаны імпартаваць.

Поруч з вельмі беднай сыравіннай базай характэрнай рысай японскага капіталізму зьяўляецца надзвычайная вузкасьць унутранога рынку. Узровень жыцьця японскіх сялян, прыгнечаных памешчыкамі і растаўшчыкамі, не на многа вышэй узроўню каленіяльнага сялянства. Рабочы японскіх фабрык і заводаў таксама недалёка адыйшоў па сваім жыцьцёвым узроўні ад кітайскага пралетарыя. У гэтым-та і хаваецца асноўная прычына вузкасьці ўнутранога рынку Японіі.

І зразумела, што Манчжурыя, якая мае вялізарныя запасы вугалю, у тым ліку і коксуючагася, жалеза, сланцоў (з якіх здабываецца нафта) і г. д., і якая поруч з гэтым можа стаць асноўнай базай с.-г. сыравіны для японскай прамысловасьці—даўно ўжо прыцягвала ўвагу японскіх імпэрыялістаў.

А калі ўлічыць, што Манчжурыя з яе 30 мільённым насельніцтвам зьяўляецца значным рынкам збыту тавараў японскай прамысловасьці, дык будзе зразумелым значэньне Манчжурыі для імпэрыялістычнай Японіі.

Зараз амаль уся Манчжурыя акупіравана ваеннымі сіламі японскага імпэрыялізму. «Барацьба» бінсяньскай генэральнай клікі з японскай ваеншчынай становіць сабою толькі асобную форму вытаргоўваньня больш высокіх пастоў у «новай Манчжура-Мангольскай дзяржаве», больш высокай цаны за распрадаж кітайскай тэрыторыі. Ствараецца новая «незалежная» дзяржава, якая будзе толькі асобнай палітычнай формай каленіяльнага прыгнечаньня краіны японскім імпэрыялізмам.

Поруч з гэтым японскі капітал захапляе ў свае рукі ўсё новыя эканамічныя пазіцыі ў Манчжурыі. Усе чыгункі Манчжурыі, за выключэньнем Кітайска-Ўсходняй чыгункі, захоплены японскім імпэрыялізмам і ў той ці іншай форме падпарадкаваны Паўднёва-Манчжурскай чыгунцы—асноўнай японскай чыгунцы ў Манчжурыі. Усе банкі, буйнейшыя каменна-вугальныя копі, электрастанцыі і г. д., і г. д., якія належылі раней кітайскаму капіталу, цяпер «пераарганізаваны» ў японскія прадпрыемствы. Так адбываецца па ўсіх лініях ператварэньне Манчжурыі ў другую Карэю японскага імпэрыялізму.

Захоп Харбіну азначае завяршэньне каленіяльнага прыгнечаньня Манчжурыі. Аднак, захопам Манчжурыі не абмяжоўваецца агрэсія японскага фінансавага капіталу. Японскія войскі ўварваліся ва ўласна Кітай і барбарскі разбураюць буйнейшы цэнтр сусьветнага гандлю—Шанхай. Поруч з гэтым японская ваеншчына правакацыруе ўзброеныя сутычкі ў Ханькоу, Ханчжоу, Сватоу, Бэйпіне, Цяньцзіне і іншых буйнейшых гарадох Кітаю, з мэтай іх акупацыі. Гэта азначае перанясеньне арэны барацьбы з Манчжурыі ва ўласна Кітай.

Але гэты факт па новаму ставіць пытаньне аб узаемаадносінах паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі.

Але яно няўхільна выклікае таксама і абвастрэньне англа-японскіх супярэчнасьцяў. Англія на працягу апошняга стагодзьдзя ўзмоцнена ўкараняе свой «уплыў» у Кітаі і капіталаўкладаньні Англіі ў Кітаі стаяць на першым месцы. Аднак трухлеючы ангельскі імпэрыялізм ня можа марыць аб пераможнай барацьбе з маладымі імпэрыялістычнымі драпежнікамі тыпу Японіі і ПАЗШ за ўладаньне ўсім Кітаем. Яго задача, «скромней» захаваць свае пазіцыі ў Кітаі.

Першым судзеячам Японіі зьяўляецца Францыя, якая марыць адхапіць 2/3 паўднёва-кітайскай правінцыі, пажывіцца за кошт Паўночна-Ўсходняй чыгункі і г. д.

І так, абвастрэньне імпэрыялістычных супярэчнасьцяў—вось да чаго вядзе пашырэньне японскай агрэсіі на тэрыторыі ўласна Кітаю.

Пад гукі гармат у Шанхаі—у Жэнэве праходзіць канфэрэнцыя па «разбраеньню». У Шанхаі японскія гарматы руйнуюць лачугі беднякоў, па вуліцы разьязджаюць танкі, над горадам лётаюць бамбавозы.

НА ЗДЫМКУ: Дротавая загарода на вуліцах Шанхаю.

Ужо ў Манчжурыі мы можам нагледзець барацьбу інтарэсаў цэлага рад буйнейшых імпэрыялістычных дзяржаў і ў першую чаргу япона-амэрыканскі антаганізм. Аднак з пашырэньнем сфэры барацьбы на ўвесь Кітай асноўныя супярэчнасьці ўнутры імпэрыялістычнага лягеру таксама ўспраўзводзяцца ў пашыраным маштабе.

Якія-ж «інтарэсы» асноўных дзяржаў у Кітаі і якая расстаноўка імпэрыялістычных сіл?

Усім вядомы японскі плян стварэньня «Вялікай японскай кантынэнтальнай імпэрыі», у склад якой уключаецца значная частка азіяцкага мацерыка і, вядома, цалкам увесь Кітай. Ажыцьцяўленьне гэтага пляну зьяўляецца канечнай мэтай японскага імпэрыялізму.

Канкрэтнай палітычнай задачай сёньняшняга дню зьяўляецца захоп Манчжурыі і Ўнутранай Манголіі, а таксама акупацыя Паўночнага Кітаю і раду пунктаў у даліне ракі Янцзы, дзе ўкладзены значныя японскія капіталы ў тэкстыльную і мэталюргічную прамысловасьць, банкі і г. д.

Буйнейшым саперьнікам Японіі зьяўляецца амэрыканскі імпэрыялізм. Ён выступае пад сьцягам «тэрытарыяльнай і палітычнай цэльнасьці Кітаю». Але кожнае дзіця ведае, што громкая фраза мае сваёй мэтай прыкрыць імкненьне ПАЗШ ператварыць Кітай у «адзіную і непадзельную» калёнію амэрыканскага капіталізму. Прычым гэтае імкненьне зьяўляецца для дзядзі Сама не канечнай мэтай, а практычнай задачай «бягучай» палітыкі. Зусім відавочна, што перанясеньне барацьбы на тэрыторыю ўласна Кітаю ня можа ня выклікаць абвастрэньня япона-амэрыканскіх супярэчнасьцяў.

Аднак пры вучоце ўсяго гэтага нельга забываць і другі ня менш, а нават больш важнай тэндэнцыі, ва ўзаемаадносінах дзяржаў у сувязі з япона-кітайскім канфліктам. Няма ніякага сумненьня ў тым, што пад гегемоніяй амэрыканскага капіталу і з благаславеньня Лігі нацый ідзе ўзмоцненымі тэмпамі падрыхтоўка да стварэньня блёку імпэрыялістычных дзяржаў пад сьцягам разгрому кітайскіх саветаў і падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР.

Утрыманьне японскіх ваенных сіл у даліну ракі Янцзы і прысылка ім у дапамогу англа-амэрыканскіх сіл азначае непасрэдную пагрозу нападзеньня на базу кітайскай рэвалюцыі—на савецкія раёны. Зусім ясна, што гэты плян ня можа ня выклікаць дзівоснага адзінаньня імпэрыялістаў усіх масьцей.

З другога боку ў Манчжурыі рыхтуецца плацдарм для інтэрвэнцыі супроць СССР. Напасьці на СССР на Далёкім Усходзе для таго, каб палегчыць удар на нашы заходнія граніцы,—у гэтым задача падпальшчыкаў антысавецкай вайны.

Аднак, імпэрыялісты граюць з агнём. Гром гарматаў імпэрыялістычных інтэрвэнтаў з аднаго боку, здрадніцтва кітайскіх пануючых клясаў на чале з Гаміньданам, оптам і ў розьніцу прадаючых Кітай імпэрыялістычным разбойнікам, з другога—гэта няўхільна прывядзе да новага ўздыму рэвалюцыйнай хвалі. І мы цьвёрда ўпэўнены ў тым, што нарэшце, кітайскае сялянства на чале з рэвалюцыйным пралетарыятам скінуць гнёт імпэрыялізму і яго гаміньданаўскіх прыхлябальнікаў і разаб'юць крывавыя пляны імпэрыялістычных катаў.

За сацыялістычную рэканструкцыю Менску

Чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б) адзначыў, што посьпехі, дасягнутыя партыяй і рабочай клясай у барацьбе за індустрыялізацыю і калектывізацыю краіны, стварылі ўсе неабходныя ўмовы для рэканструкцыі гарадзкой гаспадаркі—гэтай важнейшай базы перабудовы быту мільённых мас працоўных на новых сацыялістычных прынцыпах. Але для ажыцьцяўленьня рашэньняў пленуму патрэбна шырокая мабілізацыя грамадзкай увагі да пытаньняў гарадзкой гаспадаркі, максымум арганізаванасьці ў справе яе рэканструкцыі, скарыстаньне ўсіх дасягненьняў у адпаведных галінах навукі і тэхнікі.

Ні адзін праект камунальных прадпрыемстваў не павінен ажыцьцяўляцца без абмяркоўваньня яго сярод рабочых мас.

Ні адна навуковая ўстанова, якая па характары сваёй дзейнасьці можа ўдзельнічаць у рэканструкцыі гарадзкой гаспадаркі, не павінна застацца пасыўнай у гэтай справе. Удзел навукова-дасьледчых устаноў асабліва патрэбны ў распрацоўцы агульнага пляну рэканструкцыі гораду.

У дачыненьні да камгасу Менска ёсьць канкрэтная дырэктыва ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб тым, **«каб асноўны праект плянаваньня гораду Менску быў скончаны да тэрміну, вызначанага пастановай СНК, і быў-бы забясьпечан навуковай кансультацыяй і абгаварэньнем праекту плянаваньня на рабочых сходах з удзелам інжынэраў і архітэктараў».** Аднак, да гэтага часу ні навукова-дасьледчыя ўстановы, ні вышэйшыя школы Менску ня прыцягнуты да дапамогі ў гэтай справе гарадзкому савету. Зусім не скарыстаны навуковыя сілы інстытуту прамысловасьці, інстытуту санітарыі і гігіены, аўта-дарожнага інстытуту і г. д. Ня прыцягнуты да гэтай справы ў належнай меры і Беларуская акадэмія навук. Такое становішча надалей недапушчальна.

Якія запатрабаваньні да новага году мы павінны высунуць? Якому асноўнаму прынцыпу павінны быць падпарадкаваны ўсе мерапрыемствы ў галіне рэканструкцыі гораду?

Такім прынцыпам павінна быць стварэньне ўмоў для максымальнай эфэктыўнасьці працы кожнага рабочага і працоўнага гораду, для максымальнага ўцягненьня ў вытворчасьць новых рабочых кадраў з ліку тых, хто зараз заняты рознымі «хатнімі» справамі і тых, хто зараз ня можа працаваць па ўмовах здароўя.

Выходзячы з гэтага на першы плян у галіне гарадзкой гаспадаркі высоўваюцца пытаньні рацыянальнага жыльлёвага будаўніцтва, санітарна-гігіенічныя мерапрыемствы, абзеляненьне гораду.

Ня меншае значэньне мае і арганізацыя транспарту: рацыянальна арганізаваны транспарт эканоміць час, мускульную і нэрвовую энэргію працоўных.

Для поўнага скарыстаньня працоўных рэсурсаў гораду, для забесьпячэньня сацыялістычнай прамысловасьці патрэбнымі ёй новымі мільёнамі рабочых рук, патрэбна карэнная рэканструкцыя быту. Толькі стварэньне ў дастатковай колькасьці ясьляў, дзіцячых садоў, пральняў, і іншых сацыяльна-бытавых устаноў вызваліць гарадзкую жанчыну ад путаў хатняй гаспадаркі і дасьць ёй магчымасьць стаць работніцай сацыялістычнай прамысловасьці.

Паказаныя асноўныя праблемы гарадзкога будаўніцтва патрабуюць для свайго вырашэньня грунтоўнага выяўленьня сучаснага становішча адпаведных галін гарадзкога жыцьця і самай цеснай увязкі іх з пэрспэктывамі нашай прамысловасьці.

Ініцыятыву ў справе вывучэньня гарадоў БССР узяла на сябе Беларуская акадэмія навук. Прэзыдыум яе вылучыў арганізацыйнае бюро, якое павінна распрацаваць дэталёвую праграму ўсебаковага вывучэньня г. Менску ў сувязі з распрацоўкай пляну яго сацыялістычнай рэканструкцыі. Для ўдзелу ў гэтай працы прыцягваюцца наступныя інстытуты БАН: Эканомікі, Савецкага будаўніцтва, Агра-глебавы, Геалёгіі, Фізыкі, а таксама Інстытут прамысловасьці, Інстытут сацыяльнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, Інстытут санітарнай гігіены, Гідра-мэтэоралёгічны, Аўтадарожны і Будаўнічы.

Пералічаныя інстытуты павінны безадкладна абмеркаваць у сябе пытаньне аб іх канкрэтным удзеле ў рэканструкцыі Менску, уключыць адпаведныя тэмы ў свае пляны, і вылучыць канкрэтных працаўнікоў для прапрацоўкі гэтых тэм.

Адзіная зводная праграма работы ў гэтай галіне ўсіх пералічаных інстытутаў будзе складзена камісіяй і прадстаўнікоў гэтых інстытутаў, Народнага камісарыяту Камунальнай гаспадаркі і Менгарсавету.

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб камунальнай гаспадарцы Менску павінна быць выканана цалкам і без спазьненьня. Навукова-дасьледчыя ўстановы і вышэйшыя школы Менску абавязаны безадкладна ўключыцца ў справу рэканструкцыі сталіцы БССР. Гэтага патрабуюць інтарэсы сацыялістычнай перабудовы жыцьця ўсіх працоўных гораду.

М. Лойко, Г. Парэчын, С. Маргелаў.

АБ АПОРНЫХ ПУНКТАХ ПАРТРАБОТЫ НА ВЁСЦЫ

Пастанова ЦК КП(б)Б

Кіруючыся пастановамі ЦК УсеКП(б) ад 5 сьнежня 1931 г. «Аб задачах і парадку арганізацыі апорных пунктаў партыйнай работы на вёсцы» і ў скасаваньне пунктаў, не адпавядаючых апошняй пастановы ЦК УсеКП(б) сваіх пастаноў ад 26 сакавіка 1931 году «Аб рэарганізацыі партсеткі на вёсцы» і дырэктыўнага ліста «Аб задачах сельпарткомаў і перабудовы партыйна-масавай работы на вёсцы»—ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прапанаваць гаркомам і райкомам перабудаваць сеткі і зьмест работы існуючых сельпарткомаў у адпаведнасьці з указаньнямі ЦК УсеКП(б) на працягу лютага месяца.

2. Указаць на недапушчальнасьць ператварэньня апорных ячэек саўгасаў, МТС і найбуйнейшых калгасаў у падраённыя камітэты партыі. Асноўнай задачай апорных ячэек і парткомаў зьяўляецца дапамога вакольным ячэйкам праз інструктаваньне і перанясеньне лепшага вопыту партыйнай, гаспадарчай і грамадзкай работы ў апорных саўгасах, МТС і найбуйнейшых калгасах на вакольныя калгасы, ператвараючы апорныя пункты ў вядучае гаспадарча-палітычнае асяродзьдзе на вёсцы з узорнымі паказьнікамі ўсёй работы.

3. Прапанаваць Аргінстру ЦК накіраваць аргпартгрупы для агляду работы апорных ячэек, пасьля чаго распрацаваць канкрэтныя паказаньні аб далейшай рабоце апорных пунктаў партработы на вёсцы.

4. ЦК КП(б)Б напамінае, што існаваньне апорных пунктаў партыйнай работы на вёсцы ні ў якім разе ня зьнімае адказнасьці з райкомаў за штодзённы нагляд і практычнае кіраўніцтва работай ячэек, якія абслугоўваюцца апорнымі пунктамі.

мець перад партыяй рад актуальнейшых задач барацьбы за бальшавіцкую пільнасьць, за непрымірымасьць да ўсякіх шкодных тэорый і тэорыек, за ваяўнічую партыйнасьць, за партыйнасьць ва ўсіх галінах работы, за барацьбу супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі і г. д.

Мы мелі і ў межах БССР рад праяў варожых тэорый, варожых ідэй, якія ішлі па лініі працягваньня трацкісцкай кантрабанды, па лініі ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, ухілаў у бок беларускага шавінізму, ідэалізацыі люксэмбургіянства і інш. Партыя і пралетарская грамадзкасьць далі жорсткі адпор гэтым выступленьням, партыя мабілізавала свае рады на барацьбу за ваяўнічую партыйнасьць ва ўсіх галінах навукі, ва ўсіх галінах культурнага будаўніцтва.

ЗА ВАЯЎНІЧУЮ ПАРТЫЙНАСЬЦЬ ПРАЛЕТАРСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ.

Перад нашай пралетарскай літаратурай, як адным з важнейшых участкаў ідэалёгічнага фронту, перад БелАППам, як асноўным праваднікам лініі партыі ў літаратуры ліст тав. Сталіна ставіць рад найбуйнейшых палітычных задач. Кожнаму вядома, што наша літаратура ўключае ў сябе поўныя элемэнты, якія ўласьцівы, скажам, навуцы аб гісторыі. Літаратура атабражае нашу сучаснасьць, фіксуе падзеі, дае ім той ці іншы аналіз, робіць той, ці іншы сынтэз. Праўда, фіксуе мастацкім словам, дае мастацкі аналіз, робіць мастацкі сынтэз. Літаратура паміма атабражэньня і арганізуе, выхоўвае чытацкія масы. Вядома, у тых формах, у тым напрамку, характар якіх вызначаецца заложанымі ў самім творы тэндэнцыямі, якія ў сваю чаргу залежыць ад аўтара, ад яго ідэалёгічнага ўзроўню, ад яго сьветапогляду, ад яго мастацкіх асаблівасьцяў, адным словам ад яго ідэалёгічнага і мастацкага «профілю».

Ці заўсёды пралетарскія пісьменьнікі бываюць на вышыні задач пралетарскай літаратуры? Ці ня маем мы часам выпадкі паслабленьня клясавай пільнасьці, выпадкі самага звычайнага гнілога лібэралізму да тых ці іншых шкодных ідэй, варожых уплываў? Ці заўсёды творы стаяць на вышыні правільнага атабражэньня мастацкі-дзейнага паказу і марксыцка-ленінскага аналізу тых працэсаў, якія адбываюцца ў нашай краіне? Ці заўсёды наш мастацкі твор можа быць сапраўдным моцным фактарам у справе арганізацыі мас паводле лёзунгаў партыі, выхаваньня гэтых мас у камуністычным напрамку?

Ці заўсёды наш твор дапамагае партыі і пралетарыяту ў штодзённай рабоце па перапрацоўцы краіны, па перапрацоўцы і старога чалавечага матар'ялу? Ці заўсёды нашы творы зьяўляюцца вострай зброяй партыі ў клясавай барацьбе, у змаганьні за сацыялізм?

Адказам можа быць: мы не заўсёды стаім на вышыні тых задач, якія стаяць перад пралетарскай літаратурай. Часам наша мастацкая прадукцыя носіць поўныя адзнакі шкодных нам, варожых уплываў. Мы маем выпадкі скажэньня нашай сапраўднасьці, уродваньне ў тым ці іншым паасобным творы, які робіцца крывым люстрам нашае сучаснасьці.

Возьмем адну з адказнейшых задач, якая ставіцца перад намі лістом тав. Сталіна, задачу барацьбы за партыйнасьць літаратуры. Ці ўсё ў нас добра тут, ці ўсё ў нас у парадку?

На жаль, мы маем шмат прарываў, шмат зрываў у гэтым напрамку.

Што мы разумеем пад партыйнасьцю літаратуры?

—Партыйнасьцю будзе насычаны той твор, які будзе стаяць на вышыні задач і ідэй камуністычнай партыі.

—Партыйнасьць—гэта барацьба супроць эмпірычных пазыцый у літаратуры, гэта разгорнуты бальшавіцкі, марксыцка-ленінскі аналіз сучаснасьці.

— Партыйнасьць—паказаць, выявіць ва ўсёй велічыні ролю і значэньне кампартыі, даць сапраўдны вобраз бальшавіка.

—Партыйнасьць — даць дзейна-мастацкі паказ сучаснасьці, паказ арганізуючы і выхоўваючы.

—Партыйнасьць—гэта ня быць старонным і пасыўным назіральнікам, а праз мастацкі твор, праз усю сваю творчасьць быць актыўным удзельнікам сацыялістычнага будаўніцтва.

—Партыйнасьць—гэта насычанасьць твору клясавай непрымірымай нянавісьцю да ўсяго шкоднага, да ўсяго старога, што так ці інакш перашкаджае пераможнаму руху наперад.

—Партыйнасьць—гэта высокамастацкі паказ барацьбы за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку.

ЗА САПРАЎДНЫ ВОБРАЗ БАЛЬШАВІКА Ў МАСТАЦКІМ ТВОРЫ.

Як жа мы змагаемся за гэтую партыйнасьць, ці паказалі мы ролю партыі, ці далі сапраўдны вобраз бальшавіка? Паглядзім жа па паасобных творах, па творчасьці нашых паасобных пісьменьнікаў. Возьмем аднаго з буйнейшых пралетарскіх паэтаў— **Андрэя Александровіча.** Трэба сказаць, што больш, чым у каго-б то ні было, творы яго апошніх год прасякнуты партыйнасьцю. І «Цені на сонцы» і «Нараджэньне чалавека» і «Напор»—любы з гэтых твораў прасякнуты непрымірымай нянавісьцю да нашых клясавых ворагаў, гэтыя творы выкрываюць нашых ворагаў, выкрываюць іх варожую, шкодную сутнасьць, выкрываюць тыя шляхі, па якіх прабіраецца часам той ці іншы вораг у наша асяродзьдзе, у нашу работу. Вершы і паэмы Александровіча адрозьніваюць яго ад шмат іншых поэтаў сваёй выключнай палітычнай завостранасьцю, арганічнай зьвязанасьцю з практыкай, з штодзеннымі буднямі сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя вершы і паэмы пазбаўлены ў яго ад усякіх беспрадметных лірычных вохаў і ўздохаў, ад самалюбаваньня сабой, ад таго калупаньня ў душэўным сьметніку, што так уласьціва шмат якім з нашых дробна-буржуазных поэтаў, якія ў сваім поэтычным мурлыканьні нічога ня бачаць, часам, далей свайго носу, далей свайго ўласнага пупка, які да рэчы ім здаецца часам пупам усёй зямлі.

Але-ж, пры ўсіх каштоўнейшых асаблівасьцях поэзіі Андрэя Александровіча, барацьба за ваяўнічую партыйнасьць ў яго творчасьці стаіць для поэты яшчэ ня выкананай поўнасьцю задачай. Александровіч ня здолеў яшчэ даць шырока разгорнуты вобраз бальшавіка, ня здолеў яшчэ даць твор, які выявіў-бы ні з чым не параўнальную ролю партыі ў жыцьці нашай краіны, у прыватнасьці ролю партыі ў заснаваньні і разьвіцьці нашай Савецкай Беларусі, ролю партыі ў правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Нельга-ж, вядома, лічыць за вобраз сапраўднага бальшавіка, вобраз поэмы «Бальшавік Бахрым». Поэтай увага абстрактная фігура нічога агульнага ня маючая з сапраўднымі партыйцамі, якіх мы штодня бачым на заводах, на фабрыках, у ячэйках, на ўсіх франтох нашага будаўніцтва рост якіх, уплыў якіх мы назіраем штодня ў буднях нашай работы. На нашых вачох, часам, самы адсталы ў мінулым рабочы перарастае ў камуніста, перарастае ў вытрыманага бальшавіка-ленінца. На нашых вачох расьце партыя на нашых вачох у складаных абставінах фармуецца ідэйны рост паасобных камуністаў. Вось гэтых працэсаў мы ня знойдзем у бальшавіку Бахрыме. Абстрактную фігуру аўтар падае нам на самай звычайнай і непатрэбнай рамантычнай талерцы, пасыпаўшы ўсю паэтычную страву [illegible] дэтэктыўным перцам (успомніце эпізоды з жонкай героя, жонкай—шпіёнкай, прыехаўшай з замежжаў, розныя прыгоды і г. д.).

Мы ня знойдзем таксама сапраўднага вобразу бальшавіка, росту рабочага ў бальшавіка, росту самога камуніста і дыялектыкі гэтага росту і разьвіцьця і ў апошнім буйнейшым творы Александровіча—п'есе **«Напор».** Тое-ж самае мы назіраем і ў паказе вобразаў камсамольцаў у гэтай п'есе. Мы бачым іх засядаючымі, мітынгуючымі, гуляючымі ў футбол, але-ж тых глыбокіх зрухаў, якія адбываюцца ў псыхіцы, якія непрыкметны, аб якіх мы можам меркаваць па дзеяньнях чалавека, па яго паводзінах,—гэтых зрухаў, гэтых паказальнікаў росту мы ў п'есе ня маем. Адсюль некаторая сухасьць у вобразах паасобных герояў, налёты схэматызму, непераканаўчасьць паасобных вобразаў.

Цяпер аб творчасьці аднаго з буйнейшых пралетарскіх пісьменьнікаў **Платона Галавача,** аб яго аповесьцях «Вінаваты» і «Спалох на заговінах», асабліва аб апошняй, як буйнейшай зьяве нашай пралетарскай літаратуры. Трэба сказаць, што аповесьць «Вінаваты» ня мела яшчэ выстарчальнай марксыцкай крытыкі. А гэтая крытыка патрэбна, тым больш, што гэтая аповесьць была поўным ідэалёгічным зрывам на творчым шляху пісьменьніка, які пры ўсіх сваіх добрых суб'ектыўных намерах даў нам такое вырашэньне пастаўленага пытаньня, якое аб'ектыўна стала супроць лёзунгу бальшавіцкай партыйнасьці нашай літаратуры, дэмабілізуе да некаторай ступені нашу барацьбу за клясавую пільнасьць, за клясавую непрымірымасьць. У чытача ўзьнікае спачуваньне да героя аповесьці выключанага з партыі за тое, што бацька яго быў у свой час ахраньнікам. Справа ня ў тым, вінават ці ня вінават герой, ведаў ён аб мінулым свайго бацькі, ці ня ведаў. Нават, калі-б ён і ня ведаў гэтага мінулага, то ніякім чынам не апраўдваецца ўвесь той цёплы, спачувальны тон пісьменьніка да героя, тон, выклікаючы сымпатыі да «пакрыўджанага» партыяй чалавека. Назат у гэтым выпадку ня варта было-б пралетарскаму пісьменьніку займацца паказам гэтага героя, які зьяўляецца адзінкавым выключэньнем і рабіць непатрэбныя мастацкія абагульненьні. Ва ўсякім разе, у творчай дыскусіі варта больш шырока спыніцца на гэтай аповесьці, як на поўным этапе росту самага пісьменьніка, росту, не пазбаўленага тых ці іншых зрываў.

Аповесьць «Спалох на вагонах»—буйнейшы твор пісьменьніка, адно з буйнейшых дасягненьняў і ўсёй пралетарскай літаратуры. Твор, паказваючы сацыялістычную рэканструкцыю вёскі, разгортваньне калектывізацыі, вялізарныя зрухі сярод сялянскіх працоўных мас вёскі, паказ гэтых зрухаў у іх законамерным дыялектычным разьвіцьці. Але і ў гэтым, адным з найлепшых твораў нашае сучаснасьці, мы маем поўныя зрывы, поўныя недахопы. **У самым уяўленьні рэвалюцыі,** у паказе яе пераможнага наступу, успрыняцьці самой рэвалюцыі пісьменьнікам мы знаходзім паасобныя элемэнты дробна-буржуазнага ўспрыняцьця рэвалюцыі, як нечага страшнага, жудаснага, недасягальнага: «цяжка бачыць яе вышыні і было страшна перад высотамі». Аб гэтым гаворыць і залішняя слоўная пэтэтыка, рытарычная абцяжарнасьць, якую мы маем ва ўступе да аповесьці.

Але гэта не галоўнае. Асноўныя зрывы ідуць па лініі недастатковага выяўленьня ролі партыі, недастатковым паказе ролі пралетарыята, як гегемона над тымі зрухамі, над тымі працэсамі, якія адбываюцца на вёсцы ў сувязі з калектывізацыяй, у сувязі з ростам сацыялістычнай індустрыі краіны. Мы маем паасобныя зарысоўкі, паасобныя намёткі вобразу бальшавіка, маем схэматычны набросак раённага камітэту партыі, але, паўтараем, гэта толькі наброскі, намёткі. Глыбокага паказу кіруючай ролі партыі мы ня маем.

І яшчэ адзін зрыў, які ў поўнай меры зьніжае ідэалёгічны ўзровень аповесьці. Калектывізацыя, асабліва ў часе разгортваньня падзей, росту ўсяго руху, выяўляецца перад чытачом, як развязаная, нічым ня стрымліваемая стыхія. Калектывізацыя адрываецца ад агульнага ходу гістарычных падзей ва ўсёй краіне, яна не абумоўліваецца ў сваім разьвіцьці ўсім папярэднім этапам разьвіцьця краіны. Праўда, спачатку аповесьці мы ўлаўліваем дыялектычную законамернасьць руху, але потым аўтар выпусьціў з рук сацыяльныя рычагі, паплыў са стыхіяй. Вось у чым заключаюцца асноўныя недахопы аднаго з найлепшых пралетарскіх твораў.

Некалькі слоў аб творчасьці **Рыгора Мурашкі.** Мы ня маем зараз магчымасьці падрабязна спыніцца на ўсіх творах — гэта справа нашай творчай дыскусіі. Застановімся толькі на рамане «Сын», рамане, які ня ўзяты яшчэ як сьлед на вастрыё марксыцка-ленінскай крытыкі. А раман заслугоўвае самай пільнай і шырокай увагі, бо аўтар спрабуе паказаць расстаноўку клясавых сіл у рэвалюцыю 1905 году, твор бярэ на сябе адказнейшыя задачы даць мастацкі паказ ролі і значэньня нашай партыі, спрабуе даць характарыстыку розным дробна-буржуазным сацыялістычным партыям, іх рабоце ў часы рэвалюцыі. Наколькі справіўся аўтар з гэтымі адказнейшымі задачамі—пакажа наша дыскусія, пакажа дэталёвы аналіз усяго твору.

Мы спыніліся толькі на адным моманце, найбольш характэрным для творчага мэтаду пісьменьніка, ці правільней будзе сказана, аб умоўленым ранейшымі няправільнымі творчымі ўстаноўкамі, якія мы мелі ў «Прытупнічым манастыры» і «У іхным доме». Мы маем на ўвазе тую радаслоўную, якой надзяліў аўтар свайго галоўнага героя, бальшавіка Арона.

Чаго тут толькі няма: радаслоўная сама па сабе—цэлы авантурны раман. Тут і рэвалюцыянэрка маці, трапіўшая за краты, і нейкі «вяльможа», апраўдаўшы маці і г. д. і г. д. У выніку нарадзіўся сын—будучы бальшавік Арон. У чым тут справа? Аўтар залішне захапіўся сваімі сюжэтнымі меркаваньнямі і ў ахвяру ім прынёс бальшавіка, прынёс тое звычайнае сацыяльнае асяродзьдзе, скуль выходзілі гэтыя бальшавікі. Пінкертонаўшчынай, непатрэбнымі сюжэтнымі вымысламі і «изысканиями» аўтар апошліў радаслоўную бальшавіка.

Няўдалыя вобразы бальшавікоў і ў **Гурскага Ільлі,** у яго п'есе «Качагары». Паказаны ў п'есе сакратар райкому зьяўляецца нейкай бязвольнай, шэрай, без якой-небудзь хоць адзінай арыгінальнай, жывой рыскі асобай. І цяжка зразумець, што хацеў даць гэтым вобразам Гурскі—ня то вобраз апартуніста, ня то доктрынёра-начотчыка, ня то нешта падобнае на бюракрата. **Другі камуніст,** выведзены ў п'есе, вядучы барацьбу з усім адмоўным на заводзе, вядучы барацьбу з шкодніцтвам, з разлажэньнем, не знаходзіць іншага выйсьця з цяжкасьцяй, як самазабойства, ад якога ён пазбаўляецца толькі выпадкова. У паказе клясавых ворагаў у п'есе аўтар замест сапраўднага зрыву масак з іх дае нам утрыроўку, шаржы, выпускае на сцэну «болванчиков» і, тым самым, зразумела, прыніжае ідэалёгічную каштоўнасьць твору, аб'ектыўна прыніжае, дэмабілізуе барацьбу з контррэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам.

Як выяўляюць грамадзкія чыткі новага твору Гурскага—п'есы «Новы горад», аўтар ўнікае ў сваёй творчасьці ранейшых памылак, ранейшых няправільных установак у сваім творчым мэтадзе.

У ЧЫМ СУТНАСЬЦЬ НАШЫХ ПАМЫЛАК

У чым, наогул, няправільнасьць нашага паказу бальшавіка ў літаратуры?

Справа ў тым, што мы бярэм камуніста, альбо, скажам, камсамольца як нейкую абстрактную фігуру. Камуністы ў нас ў большасьці выпадкаў «готовенькие», мы ня маем раскрыцьця псыхалёгіі камуніста, паказу бальшавіка за ўзаймадзеяньні з калектывам, з асяродзьдзем у працэсах практыкі нашага будаўніцтва, мы ня маем тут дыялектыкі росту, разьвіцьця, усёй дзейнасьці камуніста.

У нашы задачы не ўваходзіў аналіз творчасьці ўсіх нашых пісьменьнікаў. Творчая дыскусія дасьць разгорнутую ацэнку і пісьменьнікам і паасобным аб'яднаньням. Трэба толькі сачыць, каб гэтая творчая дыскусія ня сыходзіла з высокага прынцыповага ўзроўню, каб гэтая дыскусія дала-б сапраўдную ацэнку нашай літаратуры, нашаму літаратурнаму руху.

ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ ЛІТАРАТУРНУЮ ПРАКТЫКУ

Якія яшчэ задачы ставяцца перад намі ўказаньнямі тав. Сталіна? Адна з асноўных задач—барацьба з адставаньнем пралетарскай літаратуры ад агульных тэмпаў і ўзроўню сацыялістычнага будаўніцтва. Барацьба за гегемонію пралетарскай літаратуры абавязвае нас пасіліць барацьбу за марксыцка-ленінскі сьветапогляд, за ідэйную і мастацкую якасьць нашых твораў, рашуча выкрываць усякія буржуазныя і апартуністычныя тэорыі і тэорыйкі на літаратурным фронце (варонщчына, пераверзеўшчына, і ім падобныя).

Заклік ударнікаў у літаратуру зьяўляецца адным са зьвеньняў агульнай барацьбы за гегемонію пралетарскай літаратуры. Гэтай работы ў нас яшчэ непачаты край.

Разгортваньне сапраўднай, глыбокай творчай вучобы, арганізацыі новых творчых груповак унутры арганізацыі, рашучыя зьмены ў рабоце з папутнікамі, ліквідацыя бясплянавасьці ў нашай непасрэднай творчай і тэарытычнай рабоце, стварэньне найбольш спрыяючых умоў для пашырэньня нашых тэарытычных кадраў, кадраў марксыцкай крытыкі, павялічэньне ўвагі пытаньням абароны краіны—вось цэлы рад актуальнейшых і неадкладных задач.

У нашых умовах і абставінах пытаньні нацыянальнай культуры і культурнай спадчыны набываюць выключнае значэньне. Мы павінны рашуча адмятаць усякія спробы апартуністычнага «сплошного» клясава-недыфэрэнцыраванага падыходу да культурнай спадчыны, супроць спроб адмаўленьня і змазваньня клясавай спэцыфікі культуры, нацыянальнай па форме, пралетарскай па зьмесьце, супроць усякіх спроб рэвізіі ленінскай тэорыі крытычнай перапрацоўкі спадчыны, супроць вялікадзяржаўных выступленьняў, як самых небясьпечных на даным этапе, супроць выпадкаў нацыянал-дэмакратычнай трактоўкі тых ці іншых падзей і праяў, супроць гнілога лібэралізму ва ўсіх яго відах і праяўленьнях.

Мы застанавіліся на самых асноўных задачах, якія стаяць перад намі ў сувязі з лістом т. Сталіна. Выкананьне гэтых задач дапаможа нам узьняць нашу пралетарскую літаратуру на новую, вышэйшую ступень, дапаможа нам стварыць сапраўдную бальшавіцкую літаратурную практыку ў злучэньні з сапраўднай бальшавіцкай літаратурнай тэорыяй.

УСІХ НЯПІСЬМЕННЫХ АХАПІЦЬ ВУЧОБАЙ

(З ПАСЕДЖАНЬНЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ШТАБУ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ДЭКАДНІКА ПРАВЕРКІ ЛІКБЕЗУ).

Учора пад старшынствам т. Чарвякова адбылося першае паседжаньне Ўсебеларускага штабу дэкадніка генэральнай праверкі барацьбы за суцэльную пісьменнасьць БССР.

З інфармацыяй аб становішчы ліквідацыі няпісьменнасьці на паседжаньні штабу выступіў нам. Наркома Асьветы т. Брыгневіч.

— На ўсёй БССР на 1 лютага ахоплена навучаньнем 80,5 проц. няпісьменных. Побач з перадавымі гарадамі—Гомлем, Віцебскам, Менскам і некаторымі раёнамі, якія стаяць на напярэдадні суцэльнай пісьменнасьці, мы па радзе гарадоў і раёнаў маем ганебныя прарывы.

— Горш за ўсё справа з лікбезам абстаіць у Магілеве, Бабруйску, Воршы, Чавусах, Быхаве і Рэчыцы, дзе процант ахопу няпісьменных лікпунктамі хістаецца ад 50 да 60.

— На радзе гарадоў і раёнаў пралетарская грамадзкасьць не мабілізавалася на баявую барацьбу за суцэльную пісьменнасьць.

Кепска справа і з ліквідацыяй малапісьменнасьці — школамі ахоплена ня больш 141.000 чал.,—значна менш, чым прадугледжана плянам.

Ня ўзьнята таксама на належную вышыню барацьба за падвышэньне якасьці работы лікпунктаў і школ малапісьменных. Слаба на мясцох змагаюцца за акуратнае 100-процантнае наведваньне заняткаў.

У заключэньне сваёй інфармацыі т. Брыгневіч спыніўся на тых мерапрыемствах, якія праводзяцца на лініі Наркамасьветы, для неадкладнага і поўнага ахопу няпісьменных вучобай.

У спрэчках выступілі т.т. Чарвякоў, Платун, Стрэле і інш.

Па інфармацыі НКА штабам прыняты цэлы рад практычных пастаноў для разгортваньня барацьбы за ператварэньне БССР да 1 мая 1932 году ў краіну суцэльнай пісьменнасьці.

Па БССР

КАРТОННАЯ ФАБРЫКА ІМЯ ВАРОЎСКАГА дзённы прамфінплян на 10 лютага выканала на 84,6 пр., на 11 лютага на 90,7 проц., на 12 лютага на 71 проц. і на 13 лютага на 84,6 проц.

ПАПЯРОВАЯ ФАБРЫКА «СПАРТАК» з 6 на 10 лютага выпрацавала 71.081 тоны паперы. Выкананьне пляну за гэтую пяцідзёнку складае 44,86 проц. За гэты час фабрыка дала 47,8 проц. прастою. З 1 па 10 лютага выпрацавана 151.000 тоны паперы. Процант выкананьня складае 45,42, процант прастою—46,15. Прастоі на фабрыцы здарыліся з-за перабояў у рабоце Бедрэсу.

МЕНСКІ ГАРСАВЕТ НА 1932 г. намеціў вялікі плян культурна-жыльлёвага будаўніцтва гор. Менску. Запраектавана пабудова пяці каменных дамоў на 500 кватэр і 187 драўляных стандартных дамоў на 1.500 кватэр. Пабудовы гэтыя будуць каштаваць 8 мільёнаў руб. На лініі культурна-асьветнага будаўніцтва будуць пабудаваны 3 каменныя 7-мігадовыя школы, і зроблены 2 надбудовы. Кошт пабудоў складае 740.000 руб. У гэтым жа годзе будзе пабудавана сталоўка для рабочых фабрыкі «Кастрычнік». Для рабочых скурпашвэйнай прамысловасьці будзе пабудаваны дом культуры.

**

Рагачэў. (Белта). Выкананьне пляну аднаразовага культзбору стаіць над пагрозай зрыву. На 13 лютага пляя выканалы на 2,6 проц. замест 50 проц. на 15 лютага, з 26 сельсаветаў раёну 16 яшчэ ня прыступілі нават да налічэньняў па культзборы. Раённымі арганізацыямі нічога ня робіцца па спагнаньні культзбору з кулацка-заможнай часткі вёскі.



Клюб мэталістаў у Віцебску.

ПАПРАЎКА

У зьмешчаным № 39 нашай газэты дакладзе т. Гікало дапушчана памылка: на 2 стар. (2 кал 1 абзац апошнія 5 радкоў) надрукавана: «барацьба на два фронты, у асаблівасьці супроць правага ўхілу, які выступае супроць бальшавіцкіх тэмпаў, застаецца і на цяперашнім этапе галоўнай небясьпекай».

Трэба чытаць:

«Барацьба на два фронты, у асаблівасьці супроць правага ўхілу, які выступае супроць бальшавіцкіх тэмпаў, застаецца і на цяперашнім этапе галоўнай небясьпекай—павінна і надалей весьціся з усёй бальшавіцкай рашучасьцю».

Усенавуч і палітэхнізацыя—адказьнейшы вучастак фронту культурнага будаўніцтва

ЗМАГАЦЦА ЗА РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАСТАНОЎ ЦК УсеКП(б) І ЦК КП(б)Б АБ ПАЧАТКОВАЙ І СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ

Змагацца на два франты

ЦК УсеКП(б) у сваёй гістарычнай пастанове аб школе даў выстарчальныя і чоткія дырэктывы ў галіне далейшага ўмацаваньня палітэхнічнай школы і паляпшаньня якасьці яе работы. Палітэхнізацыя школы ня можа ісьці адарвана ад сыстэматычнага трывалага асваеньня агульна-адукацыйных навук. Усякія спробы адарваць палітэхнізацыю ад сыстэматычнага ўсваеньня навук уяўляюць з сябе грубейшыя скажэньні сутнасьці палітэхнічнай школы.

У сьвеце рашэньня ЦК аб школе вялізарнае значэньне набывае пытаньне мэтадычнага кіраўніцтва і мэтадычнай дапамогі настаўніку. У сыстэме органаў нарасьветы павінен быць увесь дзены інстытут інструктароў, асноўнай задачай якіх зьяўляецца аказаньне сталай практычнай дапамогі настаўніку ў яго штодзеннай рабоце.

«У перыяд сацыялізму, калі пралетарыят ажыцьцяўляе канчатковае зьнішчэньне клясаў, ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, выключна важнае значэньне набывае вытрыманае камуністычнае выхаваньне ў савецкай школе і ўзмацненьне барацьбы супроць усякіх спроб прывіць дзецям савецкай школы элемэнты антыпралетарскай ідэалёгіі». (З паст. ЦК УсеКП(б)).

Матар'ялы, якія мы сёньня зьмяшчаем, сьведчаць аб тым, што рашэньне ЦК аб школе не знайшло праламленьня ў практычнай рабоце паасобных раёнаў. Мы маем яўна апартуністычныя адносіны з боку асобных кіруючых раённых работнікаў да ўсенавучу.

У Расонскім раёне па віне райвыканкому настаўніцтва пакінута без усякага мэтадычнага кіраўніцтва. Больш таго, старшыня РВК толькі-што прыехаўшага інструктара-мэтадыста скарыстоўвае для перапісу жывёлы. У раёне не працуе 14 школ, адсутнічае якая-небудзь перакваліфікацыя настаўніцтва. Побач з праваапартуністычнай недаацэнкай школьнага будаўніцтва, у Расоншчыне наглядаюцца безабразныя адносіны да настаўнікаў, якія заключаюцца ў адрываньні настаўнікаў ад школы для правядзеньня тэхнічнай работы сельсаветаў.

Не зважаючы на яскравыя дырэктывы партыі, у Магілеве вучняў 1-й ФЗС на швэйнай фабрыцы скарыстоўваюць у якасьці падсобных рабочых, што зьяўляецца скажэньнем лініі партыі ў будаўніцтве палітэхнічнай школы.

Толькі сьлепатой Крупскага аддзелу нарасьветы і райкому працасьветы можна тлумачыць той факт, што ў Пліскай савецкай школе «настаўнікі» карыстаюцца мэтадамі выхаваньня старой дарэвалюцыйнай школы нават з яе зубатычынамі і г. д.

Мы патрабуем ад НКАсьветы дэталёва абсьледваць становішча школьнай справы і прыняцьця мер для ліквідацыі прарыву ў Расонскім раёне, патрабуем ад Крупскага РВК неадкладнага зьняцьця з работы «настаўнікаў» Раманавых. Пліская школа павінна быць сапраўды савецкай палітэхнічнай школай.

Толькі ў рашучай, бязьлітаснай барацьбе на два фронты—супроць правага апартунізму, галоўнай небясьпекі, якая цягне нас назад да старой, схаластычнай, славеснай школы і супроць «левых» загібаў, якія вядуць да адміраньня школы, мы пабудуем сапраўдную палітэхнічную школу.

Зламіць апартуністычную недаацэнку ўсенавучу і палітэхнізацыі

На фронце ўсенавучу ў Расонскім раёне рад прарываў. Да гэтага часу школы раёну яшчэ поўнасьцю не ўкамплектаваны настаўнікамі. У выніку 14 школ зусім не працуе. Матар'яльная база школ дрэнная. Рад школ не забясьпечаны адпаведнымі будынкамі, не хапае абсталяваньня. У раёне не разгорнута барацьба за павышэньне якасьці школьнай працы, ніхто ня думае аб перакваліфікацыі настаўніцтва ў той час, калі ў раёне няма ніводнага настаўніка з вышэйшай адукацыяй. Амаль зусім адсутнічае мэтадычнае кіраўніцтва школамі.

Настаўніцкая канфэрэнцыя, на якой распрацоўваўся даклад аб выніках рэалізацыі пастановы ЦК аб школе, асьвятліла гэтыя недахопы.

Аддзел народнай асьветы на замку, бо загадчык АНА т. Храмянкоў і палітасьветінспэктар т. Арлоў прымацаваны райвыканкомам да аднаго сельсавету (на ўвесь час) для правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній. Гэтак сама прымацаваны да аднаго з сельсаветаў старшыня райкому працасьветы т. Бутрамееў.

Раённы інструктар-мэтадыст, па прыезьдзе з курсаў, мабілізаваны райвыканкомам на правядзеньне перапісу жывёлы. Калі загадчык АНА зьвярнуў увагу старшыні РВК т. Шкутко на спэцыяльную адносіну Наркамасьветы, у якой прыводзіўся факт скарыстаньня інструктароў-мэтадыстаў для перапісу жывёлы ў іншых раёнах і ў якой катэгарычна забаранялася рабіць гэта ў далейшым—Шкутко адказаў:

— «Мне Наркамасьветы забараніць ня можа. Я загадваю ехаць на перапіс!»

Паказаныя факты прымушаюць біць трывогу, яны гавораць аб тым, што ў Расонскім раёне гістарычныя пастановы ЦК УсеПК(б) і ЦК КП(б)Б аб школе не знайшлі практычнага праламленьня ў рабоце райвыканкому. Больш таго, з боку старшыні РВК т. Шкутко мы маем яўна галавацяпскія адносіны да ўсенавучу і палітэхнізацыі школы.

Асьветнікі.

Пліская школа патрабуе неадкладнага аздараўленьня

У в. Пліса Бобрскага сельсавету, Крупскага раёну працуюць настаўнікамі Раманаў і Раманава. Раманавы сыстэматычна ўжываюць выхаваўчыя мэтады старой школы. Настаўнік Раманаў б'е вучняў пстрычкамі па галаве, ставіць па аднаму і гуртком вучняў сярод клясы і каля стала на цэлыя лекцыі і гадзіны. Вучняў, якія спазьняліся на лекцыі, Раманавы ня пушчалі ў клясу. Напрыклад, вучань 8 год Белаўскі спазьніўся на лекцыю—настаўніца ня пусьціла яго ў клясу. Баючыся, каб не пабіў дзед, Белаўскі быў да канца заняткаў у калгасным хляве, потым, калі скончыліся заняткі, пашоў разам з вучнямі дадому. Такіх прыкладаў шмат.

Настаўніца Раманава практыкуе і такое пакараньне—пакідае вучняў пасьля лекцый на гадзіну і больш. Раманаў заціскае крытыку і самакрытыку сярод вучняў, пагражаючы выключэньнем са школы тым вучням, якія аб яго «выхаваўчых мэтадах» даводзілі да ведама ячэйкі ЛКСМБ.

З наступных фактаў відаць, што прадстаўляе з сябе Раманаў, як грамадзянін. Настаўнік Раманаў забіў 2-х сьвіней і абсмаліў іх. Гледзячы на гэтага «настаўніка», сяляне вёскі таксама смаляць сваіх сьвіней. Раманаў сыстэматычна п'янствуе. Ня толькі сам п'янствуе але на лекцыях вучыў вучняў як піць: «Ня трэба піць па адзіночцы, а толькі кампаніяй і ў складчыну». Да гэтага трэба дадаць, што Раманаў яўны антысэміт. Сыстэматычна ўжывае антысэміцкія анэкдоты, прыказкі і нагаворкі. Напрыклад, абгаворваючы работу насьценгазэты, у спрэчках сказаў: «Хоць я і не антысэміт, але скажу, што без аднаго жыда кірмаш будзе, бяз Волах Надзі насьценгазэта будзе». Гэта Раманаў ня лічыць за антысэмітызм.

У выніку выхаваўчай працы Раманавых вучні на вуліцах хуліганяць, б'юцца і г. д.

Досыць фактаў, каб паказаць твар настаўнікаў Раманавых. «Дзяржымордзе» і антысэміту Раманаву ня месца ў савецкай школе. Мы ня можам дапусьціць, каб выхаваньне дзяцей у Пліскай школе было даручана «настаўнікам» Раманавым.

В-а.

Дапамагчы выправіць недахопы 1-й Магілеўскай ФЗС

МАГІЛЕЎ. У Магілеўскай ФЗС № 1 пастанова ЦК партыі не знайшла належнай ўвагі з боку настаўніцтва і вучнёўства школы. Яны абмежаваліся толькі распрацоўкай яе і нічога ня робяць для рэалізацыі. Палітэхнізацыя ў школе ў заняпадзе. Дагавор заключан з швэйнай фабрыкай імя Валадарскага, але ён амаль зусім ня выконваецца. Вучні ходзяць на фабрыку, дзе іх скарыстоўваюць як падсобную рабочую сілу: перапасяць паліто, выварачваюць рукавы.

Працдысцыпліны ў школе няма. Вучні позьняцца і прапускаюць лекцыі, часта амаль без ніякіх прычын. У клясах на лекцыях некаторыя вучні займаюцца бузацёрствам і на гэта не зварачаецца належнай ўвагі.

Магілеўскі аддзел нарасьветы і райком працасьветы ваша задача—даскнала вывучыць становішча 1-й ФЗС і дапамагчы ёй выправіць усе недахопы.

М. Малочка.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

пра кіраўніцтва раёнамі з боку цэнтральных устаноў

1. Пераход на раённую сыстэму кіраўніцтва патрабаваў хутчэйшага пераключэньня работы цэнтральных устаноў і ўстанаўленьня іх пастаяннай жывой сувязі з усімі раёнамі, забясьпечаньня дыфэрэнцыраванага кіраўніцтва, рашучага паляпшаньня сыстэмы кіраваньня раённымі ўстановамі, ажыцьцяўленьня праверкі выкананьня дырэктыў, узмацненьня кадрамі раённага апарату, узмацненьня работы гарадзкіх і сельскіх саветаў і іх масавых органаў (сэкцый, дэпутацкіх груп) сапраўднага павароту тварам да вытворчасьці і калгаснага будаўніцтва.

2. Пры наяўнасьці некаторых дасягненьняў у перабудове работы цэнтральнага апарату па кіраўніцтве раёнамі (поўная перадача апэрацыйных правоў раёнам, абмен вопытам, кустовыя нарады), Прэзыдыум Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР адзначае, што становішча кіраўніцтва цэнтральным апаратам раёнамі ўсё яшчэ застаецца нездавальняючым, у прыватнасьці дырэктыва 3-й Сэсіі ЦВК БССР ІХ-га скліканьня і канкрэтныя ўказаньні Калегіі НК РСІ ад 24-ІІІ-1931 году аб наладжваньні кіраўніцтва раёнамі—засталіся ў асноўным па большасьці наркаматаў і цэнтральных устаноў нявыкананымі.

3. Асноўнымі недахопамі для большасьці цэнтральных устаноў па кіраўніцтве раёнамі зьяўляюцца:

а) наркаматы і цэнтральныя ўстановы да гэтага часу не прынялі неабходных мерапрыемстваў для прыстасаваньня сваёй работы да задач апэрацыйнага кіраўніцтва раённымі і сельскімі ўстановамі па сваёй сыстэме, да канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы;

б) адсутнасьць дыфэрэнцыраванага кіраўніцтва раёнамі ў залежнасьці ад іх эканамічных асаблівасьцяй;

в) недастатковая і недобраякасная жывая сувязь з раёнамі, адсутнасьць пляновага інструктажу і дапамогі раёнам;

г) бяссыстэмнасьць і блытаніна ў справе пісьмовай сувязі і кіраўніцтва; шматлікасьць тэлеграм і злоўжываньні імі; нячоткасьць даваемых інструкцыйных указаньняў і спазьненьні з пасылкай раду важнейшых дырэктыў;

д) рад наркаматаў і цэнтральных устаноў не зьвярнуў належнай увагі укамплектаваньню нізавога апарату кадрамі, асабліва спэцыялістамі;

4. Улічваючы, што пасьпяховае выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе асабліва чоткага, дыфэрэнцыраванага, сваечасовага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку цэнтральных устаноў і наркаматаў, Прэзыдыум Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР пастанаўляе:

1) Прыняць да ведама прынятыя рашэньні аб'яднаным пасяджэньнем Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і Калегіі НК РСІ ад 3-І-1932 г. па пытаньні паляпшаньня кіраўніцтва раёнамі з боку цэнтральных устаноў.

2) Абавязаць усе наркаматы і цэнтральныя ўстановы неадкладна перабудаваць сваю работу ў напрамку:

а) устанаўленьня дыфэрэнцыраванага кіраўніцтва раёнамі ў залежнасьці ад іх эканамічных асаблівасьцяй і ліквідацыі абязьлічкі ў справе кіраўніцтва раёнамі праз сталае замацаваньне адказных работнікаў, інспэктароў, і інструктароў наркаматаў і цэнтральных устаноў да пэўнай групы раёнаў, усклаўшы на іх пэрсанальную адказнасьць за сваечасовасьць, добраякасьць інструктажу і аказаньне практычнай дапамогі раёнам;

б) стварэньня спэцыяльных аргінстрчастак, у якіх павінна быць сканцэнтравана ўся работа па кіраўніцтву раёнамі (інструктаж, жывая сувязь, абмен вопытам і г. д.);

в) дасканалай прапрацоўкі ўсякага роду гаспадарчых, фінансавых, нарыхтоўчых і іншых заданьняў, якія даюцца раёнам, з тым, каб гэтыя заданьні даваліся пасьля зацьверджаньня адпаведным кіруючым наркаматам.

3. Даручыць усім наркаматам і цэнтральным установам пры распрацоўцы ўказаньняў раёнам па асобных галінах работы ўлічваць неабходнасьць выкананьня адпаведных заданьняў на падставе поўнага скарыстаньня масавай работы саветаў.

Даручыць Аргінстру ў бліжэйшы час склікаць нараду цэнтральных устаноў і арганізацый для прапрацоўкі гэтага пытаньня і дачы адпаведных указаньняў.

4. Лічыць неабходным заслухаць на бліжэйшым паседжаньні Прэзыдыуму ЦВК даклад Упаўнаважанага НК Сувязі аб выкананьні пастановы ІІІ Сэсіі ЦВК БССР ІХ скліканьня аб забясьпечаньні раёнаў і сельсаветаў тэлефоннай сувязьзю на працягу 1931 г.

5. Прымаючы пад увагу, што аднэй з рашаючых форм паляпшаньня работы цэнтральных устаноў зьяўляецца шырокае ўцягненьне працоўных мас да кіраўніцтва дзяржаўвай праз сацнамесьнікаў і шэфства заводаў і фабрык, лічыць неабходным заслухаць у бліжэйшыя часы на Прэзыдыуме ЦВК даклад НК РСІ аб выкананьні дырэктыў партыі і ўраду па гэтым пытаньні.

6. У мэтах паляпшаньня і ўдасканаленьня інструктажу раёнаў, даручыць наркаматам і цэнтральным установам у месячны тэрмін распрацаваць палажэньне аб правох і адказнасьці інструктароў у напрамку устанаўленьня пэрсанальнай адказнасьці інструктара за добраякаснасьць, сваечасовасьць інструктажу і жывой сувязі з раёнамі, за сваечасовую сыгналізацыю аб правох і недахопах раённага зьвяна і прыняцьце сваечасовых мер для ліквідацыі гэтых прарываў і недахопаў. Для зьнішчэньня шматлікіх і непрадукцыйных абсьледваньняў, лічыць абавязковым арганізацыю комплексных мэтадаў абсьледваньня.

Даручыць Арг-Інструктарскаму Аддзелу Прэзыдыуму ЦВК БССР і НК РСІ распрацаваць плян комплексных абсьледваньняў на 1932 год, улічыўшы адпаведныя пляны наркаматаў і цэнтральных устаноў.

7. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам і саветам перабудаваць сваю работу на сваечасовае і поўнае выкананьне дырэктыў партыі, ураду і цэнтральных устаноў, а таксама ўстанавіць пэрсанальную адказнасьць за правільную і сваечасовую дачу матар'ялаў, патрэбных цэнтральным установам у мэтах апэрацыйнага кіраўніцтва раёнамі.

Даручыць НК РСІ мець нагляд за выкананьнем гэтага.

8. Даручыць Арг - Інструктарскаму Аддзелу Прэзыдыуму ЦВК БССР вывучыць пытаньне падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў для раёнаў як з боку колькаснага, так і якаснага, і ў месячны тэрмін унесьці на разгляд Прэзыдыуму ЦВК БССР праэкт неабходных мерапрыемстваў па паляпшаньні гэтай справы.

9. Даручыць Дзяржпляну БССР распрацаваць і выдаць даведнік-указальнік, у якім павінны быць адбіты эканамічныя паказальнікі і характарыстыка эканамічнага разьвіцьця раёнаў, а таксама выдаць карту БССР пасьля раёнаваньня.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гілякевіч.**

9 лютага 1932 г.
г. Менск.

Нам. адказнага рэдактара **Г. АДАМСОН.**

Гуказы кіно тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня	Мастацкі фільм 19 і 20 лютага **ШТУРМ**
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз.	**ХТО ВІНАВАТЫ**
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"	З камэдыі ў адзін сэанс **Лілі ў раю, Чарлі ў тэатры і Ласо**

БЯРЭЗІНСКІ РАЙСПАЖЫЎСАЮЗ

паведамляе ўсе зацікаўленыя ўстановы і асобы якія мелі прэтэнзіі да былога Бярэзінскага Райспажыўтаварыства ў 1931 годзе

павінны прад'явіць свае прэтэнзіі ў двухтыднёвы тэрмін

з дню апублікаваньня.

Пасьля гэтага ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць

Бярэзінскі Райспажыўсаюз

Беларускае Рэспубліканскае Аддзяленьне А-Т „Устаноўка"

паводле пастаноў ураду

РЭАРГАНІЗУЕЦЦА

і наступная дзейнасьць яго пераходзіць у непасрэднае веданьне ВСНГБ

На падставе гэтага, зацікаўленым установам і асобам прапануецца па ўсім прэтэнзіям

ЗЬВЯРНУЦЦА да 27 лютага 1932 г. у „УСТАНОЎКУ"

г. Менск, Чырвонаармейская вул. № 16, 1-ы паверх,

бо пасьля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі пад увагу прымацца ня будуць

„УСТАНОЎКА"

Беларуская Кантора Акц. Т-ва „Крэдыт-Бюро"

ЗАПРАШАЕ НА СТАЛУЮ РАБОТУ

ў якасьці актывізатараў (зборшчыкаў)

грамадзян, працаваўшых у дадзены час у Страхавым Таварыстве „Нью-Ёрк", а таксама і з іншых страхавых таварыстваў.

УМОВЫ ПА ЗГОДЗЕ

З прапановамі зварочвацца ў Кантору „Крэдыт-Бюро", я ая знаходзіцца ў будынку Дзяржбанку, або ў Кантору Торгсіна ў пам. кір. т. Берсевіча.

МЕНСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ДЗЯРЖБАНКУ

даводзіць да ведама,

што па распараджэньню пастаўшчыкоў і за адмову ад акцэпту—

ПРАДАЮЦЦА НАСТУПНЫЯ ТАВАРЫ:

1. У адрас начальніка матар'яльнага склада—пакля тружаная на Р. 2626—75 кап.
2. У адрас завода „Варашылава"—Барабаны АКМЭ 46 шт. на Р. 41814.
3. У адрас швэйнай фабрыкі „Акцябр"—гузікі Гололчорныя на Р. 57558—27 кап.
4. У адрас Белсельхозснаба—сані драўляныя 25 штук на Р. 1849—75 кап.

Скрыгалаўскі с.-г. Тэхнікум

з 3-гадовым тэрмінам навучаньня па падрыхтоўцы

тэхнікаў-кармавікоў

АБВЯШЧАЕ, ШТО **ПРЫЁМ ЗАЯЎ на веснавы набор 1932 г.**

пачынаецца з 15 лютага па 15 сакавіка г. г.

Прымаюцца асобы ад 14 да 25 год якія скончылі сямігодку, ШКМ і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы.

ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ З 1 КРАСАВІКА 1932 ГОДУ

Заявы накіроўваць па адрасу м. Скрыгалаў, Петрыкаўскага раёну, тэхнікуму

Дырэктар МАСАНІН

ГАЛОЎДАРТРАНС БССР

даводзіць да ведама ўсіх гаспадарчых арганізацый БССР аб тым,

што ім, на выпадак **ПАТРЭБЫ ШОФЭРАЎ,**

неабходна зьвярнуцца ў Аўтадор

(МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 82)

і заключыць умову на падрыхтоўку шофэраў

ТЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ЯКІЯ НЯ ЗРОБЯЦЬ ЗАЯВАК ДА 25-га ЛЮТАГА 1932 году,

СТРАЦЯЦЬ ПРАВА на прад'яўленьне прэтэнзіі ў забясьпечаньні ІХ ШОФЭРАМІ

Сэктар Працы і Кадраў ГДТ

ПАСТАНОВА № 55

Народнага Камісарыяту Працы БССР і Народнага Камісарыяту Земляробства БССР

25-XII 1931 г. гор. Менск

На падставе пастановы СНК БССР за 3-X 1931 г. „Пра палепшаньне матар'яльных і бытавых умоў вэтработнікаў і зоатэхнікаў БССР" Народны Камісарыят Працы і Народны Камісарыят Земляробства ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. У мэтах ліквідацыі ўраўнілаўкі і ўвядзеньня стымулюючай сыстэмы аплаты працы (зьдзельная, прагрэсіўна-прэміяльная) вэтработнікаў і зоатэхнікаў, устанавіць з 1-І-1932 г. наступныя дыфэрэнцыраваныя стаўкі заработнай платы, разьбіўшы сыстэмы і ўстановы, дзе працуюць вэтработнікі і зоатэхнікі на 3 групы:

Да 1 групы аднесьці вэтработнікаў і зоатэхнікаў, занятых у сыстэмах Трэста „Сьвінавод", эпізотычных атрадах ВЭТ, у Калгасцэнтру, устанавіўшы зарплату ў іх:

Вэт. урачам і зоатэхнікам . . .	175—200—225 р. у м-ц
Вэт. фэльчарам і тэхнікам з сярэдняй адукацыяй пры ўрачах і зоатэхніках	100—110 р. у м-ц
Фэльчарам і тэхнікам на самастойных пунктах	115—130 р. у м-ц
Тэхнікам і вэт. фэльчарам без сярэдняй адукацыі	80—95 р. у м-ц

Да другой групы аднесьці вэт. работнікаў і зоатэхнікаў, занятых у сыстэме „Белкаапсельаб'яднаньня", Малочна-Прамысловага Трэсту, Малочна-Садовага Трэсту і Бел[illegible], устанавіўшы зарплату:

Вэт. урачам і зоатэхнікам . . .	165—185—200 р. у м-ц
Вэт. фэльчарам і тэхнікам з сярэдняй адукацыяй пры ўрачах	90—100 р. у м-ц
Вэт. фэльчарам і тэхнікам на самастойных пунктах . . .	100—110 р. у м-ц
Тэхнікам і фэльчарам без сярэдняй адукацыі	70—80 р. у м-ц

Да трэцяй групы аднесьці вэтработнікаў і зоатэхнікаў, занятых у сыстэме НК Шляхоў Зносін, Скурсындыкату, Птушкавотрэсту, Птушкагасцэнтру і інш. установах, устанавіўшы зарплату:

Вэтурачы і зоатэхнікі	150—170—190 р. у м-ц
Фэльчарам і тэхнікам пры вэт. урачох і зоатэхніках . . .	75—85 р. у м-ц
Вэт. фэльчарам і тэхнікам на самастойных пунктах . . .	85—100 р. у м-ц
Вэт. фэльчарам і тэхнікам без сярэдняй адукацыі . . .	65—70 р. у м-ц

Увага: Вэт. урачам і вэт. фэльчарам саўгаснай і калгаснай сыстэмы ў Багамольскім, Асьвейскім, Тураўскім, Старобінскім, Плешчаніцкім, Лельчыцкім і Карманскім раёнах—стаўкі зарплаты павялічваюцца на 10 проц.

2. Для санітараў, якія працуюць у сыстэмах усіх трох групах устанаўляюцца наступныя стаўкі ў гарадох: Менск, Гомель, Віцебск, Бабруйск, Магілеў, Ворша, Барысаў, Слуцак, Мазыр і Полацак—65 руб. у месяц; у астатніх раёнах—50 руб. у месяц.

Трыхіноскапістым, незалежна ад груп—100 р. у м-ц, аскалістым—100 руб. у месяц; арэзчыкам і дэзінфэктарам—60 руб. у месяц; прэпаратарам і прывіўшчыкам—70 руб. у месяц; лябарантам Магілеўскай Занальнай Станцыі за вывучэньне сьвіных хвароб і Віцебскага Вэтэрынарна-Дасьледчага Інстытуту—110—130 р. у м-ц, у астатніх—90—110 руб. у месяц.

3. Для вэтработнікаў (спэцыялістых урачоў), якія заняты ў Бактэрыёлёгічных лябараторыях і бактэрыёлёгічных габінэтах, устанавіць:

Для загадчыкаў бактэрыёлёгічных лябараторый—225—250 руб. у месяц астатні пэрсанал масавай кваліфікацыі гэтых устаноў аплачваецца па стаўках, паказаных у п. 2-м.

4. Для вэт. урачоў, якія працуюць на карантынных і экспортна-імпортных пунктах—зарплату ўстанавіць ад 200 да 225 руб. у месяц. Фэльчарам пры іх ад 100 да 115 руб. у месяц.

5. У межах паказаных у п. п. 1, 2, 3 і 4-м стаўак, прадставіць права кіраўнікам трэстаў, саўгасаў, райкалгассаюзаў і цэнтральных устаноў, устанаўляць вэт. работнікам у залежнасьці ад маштабу і аб'ёму работы, стажу, адукацыі, адказнасьці выконваемай працы, якасьці і інш. фактараў—аклады з такім разьлікам, каб даць магчымасьць сапраўды ацэньваць кваліфікаванага працаўніка.

6. Новую сыстэму заработнай платы ўвесьці ў жыцьцё з 1-га студзеня 1932 году.

Наркампрацы БССР БАСКІН

Нам. Наркамзему БССР МАСЮКОЎ

Узгоднена з НКФ АБРАМСОН.

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь"

—) ПАТРАБУЮЦЦА (—

на дзённую і вячэрнюю работу

МАШЫНІСТКІ,

якія добра ведаюць беларускую мову

Зварочвацца ад 12 да 19 гадз., Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх.

ЗГУБЛЕНЫ.

Паявая кніжка № 187 Ночкіна М. П., выд. Аварыцкім райспажывсаюзам. Кв. 1259-п.

Вайсковы білет Панфіленка К. С., выд. Мазырскім ваенкаматам нарадж. 1905 г. Квіт. 1260п.

Членскі білет Леднёва І. Е., выд. саюзам прац. зямлі і лесу. Кв. 1262-п.

Асабовае пасьведчаньне Кальцовай М., выд. Мсьціслаўскім гарсаветам. Кв. 1263-п.

Вайсковая кніжка Камара П. Т., выд. Тураўскім РВК. Кв. 1264-п.

Пасьведчаньне аб сканчэньні Вузьдзенскай 7-годкі Змачынскага А. Ю., даведка аб выбарчых правах, мэтрычны выпіс. Даведка аб сацыяльным становішчы. Кв. 1265-п.

Дакумант Тарасенкі П. І., выд. Нараўлянскім РВК. Квіт. 1266-п.

Пайніцкая кааперацыйная кніжка Кулешовай Х. Квіт. 1261-п.

АДРАС РЭДАКЦЫІ і ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Пляц Волі, 17. Тэлефоны: Адказны рэдактар—7-69, адказны сакратар 4-78, сэктары 615, выпускаючы—12 65 (два званкі), выдавецтва—2-44.

Умовы падпіскі: на 1 год—12 р., 6 месяцаў—6 руб., 3 м-цы—3 руб., 1 месяц—1 руб. Падпіска прымаецца выключна на пошце

Упаўнаваж. Галоўлітбел. № А—51.

Друкарня імя Сталіна.